БЕЛАРУСКАЯ МАЛАДЗЁЖНАЯ ГАЗЕТА

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

25 студзеня 1994 г.
Аўторак
№ 9(13725)
Кошт у розніцу 20 рублёў
Выдаецца з 1921 года

У НУМАРЫ:

☐ *"Беларускі шлях":* ЧАЛАВЕК БЕЗ РОДНАЙ МОВЫ – "ТРУП". 2

☐ *Эканоміка.* ВОПЫТ ВЫЖЫВАННЯ ВА ЎМОВАХ РЫНКУ. 2

☐ *"Гістары-ёграф":* КНЯЗЬ-ВАНДРОЎНІК. 3

"БЕЛАРУСКІ "SUPER-TOP-93": спецыялісты пра нацыянальную поп-музыку. 3

Малюе Віктар ДУБОВІК

Краіну — з малатка. *Фота Сяргея БРУШКО.*

Кур'ер "ЧЗ"

АЭС "без трэшчыны" не можа

Як паведамлялася ўжо, 18 студзеня з-за ўзнікшай цечы быў спынены першы блок Ігналінскай АЭС.

Паводле інфармацыі, атрыманай у дырэктара станцыі Віктара Шавалдзіна, прычынай цечы на адным з трубаправодаў сістэмы аварыйнага расхалоджвання рэактара была трэшчына ў зварным шве трубаправода дыяметрам 100 міліметраў. Да такога вываду прыйшлі спецыялісты АЭС сумесна з прадстаўнікамі Дзяржінспекцыі па бяспецы ў атамнай энергетыцы, якія абследавалі пасля расхалоджвання першы рэактар.

Віктар Шавалдзін таксама паведаміў, што на ліквідацыю няспраўнасці і правядзенне неабходных выпрабаванняў спатрэбіцца 4-5 дзён. Арыенціровачная дата ўключэння энергаблока — 26 студзеня.

Радыяцыйная абстаноўка на станцыі не адрозніваецца ад звычайнай і складае 5-7 працэнтаў ад дапушчальных значэнняў.

БЕЛІНФАРМ.

Хто да радзімы ласку мае...

Будучым летам, у ліпені, берасцейцы мяркуюць урачыста і з размахам адсвяткаваць 975-я ўгодкі роднага горада.

Берасце — адзін з найстаражытнейшых гарадоў Беларусі, што знаходзіцца на беларуска-польска-ўкраінскім памежжы, таму арганізатары свята спадзяюцца ператварыць яго ў шматнацыянальны фэст славянскіх культур.

Аб размаху плануемай імпрэзы сведчыць і тое, што нядаўна ў шэрагу беларускіх газет у замежжы (у Канадзе, Вялікабрытаніі, ЗША і г.д.) з'явіўся так званы "Зварот да берасцейцаў у свеце", дзе, у прыватнасці, гаворыцца:"Мы чакаем усіх, хто да роднай зямлі ласку мае, хто нарадзіўся, жыў або чые продкі паходзяць з Берасця і гарадоў ды вёсак Заходняга Палесся".

Адзін з ініцыятараў свята — грамадскае аб'яднанне "Стары горад" — ужо сёння збірае водгукі і прапановы аб ягоным правядзенні на адрас: 224000, Беларусь, г.Берасце, паштамт, а/с 40, "Стары горад".

Цікава, што ідэя святкавання 975-годдзя Берасця з разуменнем сустрэта і афіцыйнымі структурамі. Напрыклад, выдаваны ў Канадзе і ЗША часопіс "Зважай" змясціў рэкламную абвестку, што "калектыўныя заяўкі на ўдзел у імпрэзе амерыканскія беларусы могуць накіроўваць на адрас пасольства Рэспублікі Беларусь у ЗША: 1619, New Hampshire Avenue, N.W.Washington, D.C. 20009, Embassy of Belarus".

Відаць, будзе сапраўднае свята на нашай зямлі.

Вітаўт МАРТЫНЕНКА, ЧЗ-інфарм.

Стане яшчэ лепей?

У Нацыянальным прэс-цэнтры адбылася прэс-канферэнцыя галоўных "транспартнікаў" Беларусі.

Міністр транспарту Сцяпан Шкапіч, генеральны дырэктар "Белавія" Алег Рыжыкаў і іншыя ў адзін голас запэўнівалі прысутных журналістаў, што ў прынцыпе ў нас усё добра, трэба толькі пачакаць некалькі год — стане яшчэ лепей.

Намеснік кіраўніка Беларускай чыгункі Уладзімір Барысюк казаў, што колькасць пасажыраў на паяздах узрасла на 20 працэнтаў. Дырэктар "Белавія" на пытанне аб лёсе аэрапорта "Мінск-2" адказаў, што заходні капітал зацікаўлены ў нашай інфраструктуры, таму інвестары ахвотна ўкладаюць грошы ў авіяпрамысловасць. Зараз на Беларусі існуюць адна дзяржаўная і дзве незалежныя авіякампаніі. Але канкурэнтаў у "Белавія" значна больш. Каб вырашыць праблемы з паркам самалётаў, які маральна састарэў, "Белавія" плануе арандаваць "Боінгі". Нягледзячы на зніжэнне аб'ёму перавозак на 50 працэнтаў, яна захавала асноўныя паветраныя лініі і ажыццяўляе праграмы па супрацоўніцтву з Егіптам, Суданам і Венгрыяй.

Кіраўнік ВА "Мінскпасажыраўтранс" Васіль Чалоўскі заявіў, што зараз льготамі на праезд у аўтатранспарце карыстаецца 5,9 мільёна чалавек — больш чым палову ўсяго насельніцтва рэспублікі. А адна паездка ў грамадскім транспарце рэальна каштуе тысячу рублёў. Зараз колькасць перавозак аўтатранспартам у Беларусі зменшылася на 20 працэнтаў. Для абнаўлення аўтапарку патрабуецца 4—5 гадоў, за гэты час плануецца пабудаваць у рэспубліцы 3 заводы, па вытворчасці аўтобусаў.

Транспартнікі падкрэслілі, што ў сваёй далейшай дзейнасці бяруць накірунак на інтэграцыю авія- і чыгуначных перавозак з Расіяй.

Лідзія РЫЖАНКОВА.

"Мы паедзем, паімчымся?.."

Яшчэ некалькі месяцаў таму гэты працоўны калектыў быў сярод лепшых не толькі ў сваёй сістэме аўтамабільнага транспарту, а і наогул у рэспубліцы.

Шэсць гадоў аўтатранспартнікі парка № 2 беларускай сталіцы працавалі без адзінага здарэння. Яны перавозілі сотні тысяч пасажыраў, чым, вядома ж, заслугоўвалі ад удзячных людзей шчырыя падзякі і прызнанні.

На жаль, сёння ў працаўнікоў аўтапарка № 2 Мінска, як і ў большасці з нас, процьма нявырашаных пытанняў і праблем, і самая галоўная з праблем — абвастрэнне ўзаемаадносін з пасажырамі. Прычым, не па віне аўтатранспартнікаў. У выніку падаражання паліва і энерганосьбітаў у некалькі дзесяткаў разоў павялічыліся цэны на білеты. Горш таго, пачалі закрывацца маршруты руху аўтобусаў. Летась, напрыклад, у 60 населеных пунктаў Беларусі, якія раней абслугоўваў парк № 2, перасталі хадзіць аўтобусы. Калі не будуць прыняты тэрміновыя меры, не выключана, што ліквідуюцца ў бліжэйшы час яшчэ каля адной трэці рэйсаў...

Алесь МЯСНІКОЎ.

Беларускія рок-гурты ствараюць свой цэнтр

У канцы мінулага тыдня рэдакцыя атрымала пісьмо ад пяці найбольш вядомых беларускіх гуртоў "Крама", "Мроя", "Новае неба", "Палац", "Уліс".

Прадстаўнікі беларускай рок-музыкі звяртаюцца да Старшыні Вярхоўнага Савета С.Шушкевіча, Старшыні Савета Міністраў В.Кебіча, старшыні Мінгарвыканкама А.Герасіменкі, незалежных прадпрымальнікаў Рэспублікі Беларусь.

Паводле іх слоў, можа здацца неактуальным узгадваць пра магчымую смерць духу, калі ў краіне склалася цяжкая эканамічнае становішча.

Беларускія рок-музыканты занепакоены тым, што рэспубліканскіх слухачоў і гледачоў выхоўваюць не заўсёды высакаякасная музыкай, якая амаль што цэлымі днямі гучыць па радыё і тэлебачанні. Кормяць дух той музыкай, якую нашы мясцовыя "зоркі" лепяць, страціўшы сувязі з нацыянальнай культурай. І гэтая эрзац-культура, трэба дадаць, мае добрую фінансавую падтрымку як дзяржаўных устаноў, так і камерцыйных структур, якія выдатна разумеюць , што зарабіць грошы і зрабіць сабе рэкламу значна прасцей, калі штучна падтрымліваць нізкія густы масавага слухача. І такі стан, гаворыцца ў звароце, нельга лічыць натуральным у незалежнай дзяржаве, бо музыка, у тым ліку і рок-музыка, — значная частка нацыянальнай культуры, якая ў цывілізаваным грамадстве карыстаецца падтрымкай дзяржавы і з'яўляецца яе гонарам. Тым больш, што беларуская рок-музыка, якая нясе ў асяродак сваіх слухачоў адраджэнскую ідэю, клапоціцца аб захаванні духоўнасці і менталітэту нацыі, з'яўляючыся густоўнай, прафесійнай, знаходзіцца ў занядбалым стане.

Менавіта таму гурты "Крама", "Мроя", "Новае неба", "Палац", "Уліс" вырашылі стварыць незалежную структуру — Цэнтр беларускага рок-н-ролла — і вельмі спадзяюцца на ўвагу і падтрымку дзяржаўных улад і камерцыйных структур.

Курсы валют на 24 студзеня:

	Даляр ЗША		Нам. марка	
	Скупка	Продаж	Скупка	Продаж
"Комплекс"	5800(6300)	600	–	(3580)
"Бел-бізнесбанк"	6000	6400	3450	3650
"Прыор"	5950	6200	3400	3550

(У дужках —курс за безнаяўны разлік)

РЭПЛІКА

Стала холадна Максіму ў Яраслаўлі

Спачатку здзіўленне, а потым шчырае абурэнне выклікала ў работнікаў музея Максіма Багдановіча ў Мінску пісьмо ад іх калег з Яраслаўля. Кіраўніцтва Дома-музея вядомага беларускага паэта, што стаў філіялам Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея-запаведніка М.А.Някрасава ("Карабіха"), просіць згоды на дэмантаж экспазіцый і абсталявання з прычыны размарозкі ацяпляльнай сістэмы.

Дом у цэнтры Яраслаўля па вуліцы Чайкоўскага (былой Любімскай), які Багдановіч займаў з канца 1912-га да сярэдзіны 1914-га, сваё другое жыццё атрымаў толькі год назад. Тады, да 101-й гадавіны з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры, паміж Міністэрствам культуры нашай рэспублікі, адміністрацыяй Яраслаўскай вобласці, музеямі Багдановіча ў Мінску і Някрасава ў Карабісе быў заключаны дагавор на супрацоўніцтва тэрмінам на сем гадоў. А да гэтага мясцовыя ўлады пераносілі і рэстаўрыравалі будынак, які ледзь не пайшоў пад знос, а беларускі бок займаўся стварэннем экспазіцыі. Міністэрства культуры Беларусі фінансавала распрацоўку тэматычнага плана, выраб абсталявання і сам мантаж экспазіцыі, канцэпцыю якой распрацаваў і ўласнымі рукамі выканаў цудоўны беларускі мастак Генадзь Чысты. Мінскі музей Багдановіча перадаў у Яраслаўль каштоўныя, у тым ліку і арыгінальныя экспанаты, таму што паэт пражыў у гэтых мясцінах цэлыя шэсць гадоў свайго кароткага жыцця.

Урачыстае адкрыццё Дома Багдановіча на расійскай зямлі, у якім ён пражыў радасць выхаду першага зборніка "Вянок", адбылося ў снежні 92-га з вялікай помпай. Рэпартаж пра гэту падзею здымала тэлебачанне "Астанкіна", аб ім было паведамлена па каналах ІТАР-ТАСС.

Але нават гадавіну экспазіцыі "Беларускі паэт з берагоў Волгі" святкаваць не прыйшлося. Кіраўніцтва Яраслаўскага філіяла паведамляе ў сваім пісьме, што цяпер не можа гарантаваць зберажэнне экспазіцыі. Дык што ж, вяртаць яе дадому, у Беларусь? А як жа тады адзіная культурная прастора, пра якую так любіць гаварыць інтэлігенцыя па абодва бакі расійска-беларускай граніцы?

БЕЛІНФАРМ.

ПАДЗЕІ ТЫДНЯ

Там, за зачыненымі дзвярыма, трашчалі чубы. А нам што рабіць?

☐ Андрэй ВАСІЛЕВІЧ, "ЧЗ"

Вельмі цяжкім атрымаўся мінулы тыдзень. Мяркуйце самі: калі такое было на Беларусі ў суверэнную пару (пра бэсэсэраўскія часы гаварыць няма чаго!), каб асобныя дэпутаты ўсур'ёз дамагаліся адстаўкі Старшыні Вярхоўнага Савета, прэм'ер-міністра, генеральнага пракурора, міністра ўнутраных спраў і старшыні КДБ? (Звышмагутная кучка — нічога не скажаш!).

Менавіта на мінулым тыдні зноў было абвешчана, што ля Дома ўрада з'явілася вайсковае падраздзяленне. Паколькі наша грамадства напалохана крывавымі маскоўскімі падзеямі, то людзі ў шынелях і са зброяй выклікаюць негатыўныя аналогіі.

Але агляд падзей больш лагічна пачаць з панядзелка. У той дзень, напярэдадні адкрыцця сесіі Вярхоўнага Савета, адбылося пасяджэнне Канстытуцыйнай камісіі. На ім выступіў генеральны пракурор Васіль Шаладонаў, праўда, у якасці кіраўніка пагаджальнай групы.

Як вядома, сесія не раз імкнулася дабіцца згоды ў прынцыпі новай Канстытуцыі і неаднойчы пераконвалася, што згода — не больш чым светлая мара.

Закінуць праект на антрэсолі? Немагчыма. Напісаць новы? Навошта, калі і той, што ёсць, адкрыты для самых розных папраўак.

Стварылі пагаджальную камісію, маючы на ўвазе, што за адным вузкім сталом бэнэфаўцы, камуністы, цэнтрысты і проста дэпутаты, якія працуюць самі па сабе, вынайдуць уратавальны рэцэпт, нейкую формулу, якая спадабаецца ўсім.

Рэкамендацыі, з якімі Васіль Шаладонаў азнаёміў Канстытуцыйную камісію, падаліся спрошчанымі: лічыць неабходным увядзенне прэзідэнцкай пасады і арганізацыйнымі намаганнямі сабраць на сесію як мага больш дэпутатаў (праблема кворуму, дарэчы, — адна з невылечных хібаў беларускага парламента).

Стала ясна, што пагаджальная камісія пайшла па спрошчанай дарожцы (больш таго, пасля выявілася, што і самім пагаднянлікаў поўнасцю В.Шаладонаў сабраць не мог).

Члены Канстытуцыйнай камісіі Віктар Ганчар, Дзмітрый Булахаў падкрэслівалі, што распрацоўка зместу Асноўнага Закона ўжо не хвалюе. Існуюць адладжаныя з усіх бакоў фармулёўкі ў розных варыянтах. Велічэзным валуном на шляху паўстала адсутнасць палітычнай згоды. Адным хочацца мець вельмі моцнага прэзідэнта, другія бачаць у гэтым прэзідэнцтве калыску для дыктатарства.

Што рабіць? Пагаджальная камісія ў былым складзе фактычна склала ад бяссілля рукі...

Станіслаў Шушкевіч прапануе фарсіраваць выбары прэзідэнта (а быў жа самым шчырым прыхільнікам парламенцкай рэспублікі!) у абход новай Канстытуцыі, зрабіўшы папраўкі ў дзеючае заканадаўства. "Гэта абсурд, — запярэчыў яму Аляксандр Лукашэнка.— Неабходна тэрмінова ліквідаваць у перамовах нязгоду паміж палітычнымі плынямі і партыямі і дамагчыся кампрамісу".

Зноў жа ўзнікае пытанне, якім чынам? Прапануецца адкласці ўсе справы Станіславу Шушкевічу і шукаць паразумення не фармальна, а ў гутарках ледзь не а кожным дэпутатам альбо знайсці каго-небудзь на ролю палітычнага чаўнака — няхай снуе паміж левымі і правымі.

Пагаварылі члены камісіі і разышліся ў спадзяванні на беларускае "як-небудзь".

Сесія ж паказала, што тупік у адносінах да прэзідэнцтва яшчэ больш цёмны, чым уяўлялася. А менавіта гэта гучнае пытанне і з'яўляецца тым каменем, аб які разбіваюцца надзеі.

І хто ведае, чым бы займаліся дэпутаты, прыняўшы Статут СНД з агаворкамі, патаптаўшыся вакол праекта Канстытуцыі, калі б не падкінуў ім лёс цікавую цацку — справу аб арышце літоўскіх камуністаў у Мінску. Вельмі падабаюцца нашым дэпутатам такія вось грымотна траскучыя пытанні. Па-першае, просяць журналістаў пакінуць залу, падругое, просяць саноўных чыноўнікаў даць тлумачэнне з трыбуны, па-трэцяе, узнікае рэальная магчымасць у некага адабраць пасаду, а некаму даць.

У самім арышце літоўскіх камуністаў Буракявічуса і Ярмалавічуса прысутнічае як трагедыя, так і фарс. Трагедыя, бо ў любых умовах пагоні, арышты, перасяленне ў камеру з кратамі — гэта нядобрае. А фарс у тым, як мінскія камуністы перакідвалі аднадумцаў з Літвы з адной кватэры ў другую, гулялі ў канспірацыю — ці не прасцей было належным чынам прасіць улады аб палітычным прыстанішчы? Магчыма, перашкаджала старое ўяўленне аб адсутнасці межаў на прасцягах апланаванага Савецкага Саюза...

Парадокс яшчэ ў адным: пасля перамогі Бразаўскаса нашы левыя радаваліся: камуністы сябе пакажуць. І вось адны літоўскія быццам бы камуністы ад Бразаўскаса ловяць другіх літоўскіх камуністаў ад КПСС, а мінскія прыхільнікі светлай будучыні ініцыіруюць парламенцкі крызіс з гэтай нагоды.

Арышт Буракявічуса і Ярмалавічуса стаў козырам для тых, хто хоча паказаць "кузькіну маці" міністру ўнутраных спраў У.Ягораву і старшыні КДБ Э.Шыркоўскаму. Як жа — парушылі закон!

Але парламенцкае слуханне за зачыненымі дзвярыма паказала, што "пачапляць усіх сабак" толькі на міністра і старшыню не атрымаецца. Бо беззаконне, калі яно і мела месца, бласлаўў генеральны пракурор В.Шаладонаў. Няхай сабе і па тэлефоне, гэта даволі звычайная форма савецкай юрыдычнай практыкі. Папершае, якім чынам прадстаўнікі літоўскай спецслужбы праехалі праз пагранічныя пасты — сюды і назад? Ці не бутафорыю мы маем у якасці дзяржаўнай мяжы з Літвой? Па-другое, факты аб дзеяннях літоўскай спецслужбы на нашай тэрыторыі — не першыя. І становіцца зразумелым, што камуністы і іх прыхільнікі вырашылі набыць на гэты раз палітычны капітал.

Зразумела, што Беларусь не мае ўсіх належных атрыбутаў дзяржаўнасці. І кожны з грамадзян будзе мець рацыю, калі выставіць прэтэнзіі і Шушкевічу, і Кебічу. У рэшце рэшт, гэта і было зроблена на закрытым пасяджэнні.

Але ў цяжкіх слоўных баталіях нічога плённага дэпутаты не вырашылі — яны працягнуцца сёння.

Тым часам Аляксандр Лукашэнка зрабіў заяву, што ягоная камісія актыўна працавала і мае што сказаць дэпутатам. Несумненна, атмасфера разагрэецца яшчэ больш.

А што ж войскі, выведзеныя да Тэатра музкамедыі? Пытанне заставецца нявысветленым, бо тлумачэнні камандуючага ўнутранымі войскамі Канстанціна Платонава выклікалі здзіўленне. Быццам бы нехта патэлефанаваў яму і прыгразіў беспарадкамі. Гэта пужаны заяц баіцца куста, а міністрам чаго баяцца? Адстаўкі — дык гэта звычайная з'ява ў нармальных краінах. Навошта зброяй бразгаць?

ДЗЕВЯТАЕ НЕБА

"Еўраньюс"

МОСТ У НЕБЫЦЦЁ

У мінулыя выхадныя ўраган незвычайнай сілы абрушыўся на Нарвегію.

"Суперчэннэл"

Адзін чалавек загінуў, сотні засталіся без электрычнасці. У вясковай мясцовасці вецер зрываў з дамоў дахі. Не абышлося без трагедый і на моры. Непадалёк ад Бергена ўраган выкінуў судна на мост паблізу ўзбярэжжа. Людзі выратаваліся дзякуючы абломкам моста, па якіх яны ўскарабкаваліся наверх.

"МЕКА" ДЛЯ ЎГОНШЧЫКАЎ

Чарговая спроба ўгону самалёта адбылася ў нядзелю раніцай.

Самалёт з 43 пасажырамі ляцеў з Дакара, калі ўгоншчык запатрабаваў накіраваць авіялайнер у Рым, але быў затрыманы. Ён аказаўся эфіопцам. Прычыны і акалічнасці злачынства пакуль дакладна не вядомыя. Рым стаў сапраўднай "мекай" для эфіопскіх угоншчыкаў пасля таго, як у 1992 годзе два іх суайчыннікі атрымалі палітычнае прыстанішча ў Італіі.

ВЫЦІРАЮЦЬ НОГІ... АБ ПРЭЗІДЭНТА

Як паведаміў нямецкі часопіс "Шпігель", не пашчасціла экс-прэзідэнту ЗША Джорджу Бушу. Цяпер па яго твары зможа прайсціся кожны, хто захоча.

Перад уваходам у адну з багдадскіх гасцініц кіраўніцтва выложыла партрэт Буша з выскалеными зубамі. Пад партрэтам напісана на арабскай і англійскай мовах: "Буш — злачынец". Такім чынам іракцы паказваюць сваю нянавісць да галоўнага, як яны лічаць, свайго ворага ў апошнія гады.

■

"Уорлднэт"

АФІЦЫЙНА

Днямі адбылося пасяджэнне Дзяржаўнай камісіі па ўдакладненню правапісу беларускай літаратурнай мовы. Камісія завяршыла першы этап работы і вынесла на разгляд грамадскасці свае прапановы па зменах у правапісе. Друкуючы вынікі гэтага этапа работы, рэдакцыя "Чырвонай змены" звяртаецца да чытачоў з просьбай даслаць свае заўвагі і меркаванні, якія потым будуць перададзены ў камісію.

(Аб рабоце камісіі чытайце на 3-й стар.).

Бізнес-клас

Вядучая рубрыкі ВераПАЛЯКОВА
Тэл. 68-28-52

Весткі з Саюза прадпрымальнікаў Беларусі

Днямі адбылася закрытая кансультатыўная сустрэча Савета беларускай канфедэрацыі прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў з дэпутатамі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Мэта — давесці да ведама дэпутатаў заклапочанасць вытворцаў і прадпрымальнікаў сённяшнім станам такіх пытанняў, як прыватызацыя і раздзяржаўленне, удасканаленне падатковага заканадаўства, канцэпцыя эканамічнай арыентацыі Рэспублікі Беларусь, праблемы развіцця прадпрымальніцтва.

Прадстаўнікі Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі, Саюза прадпрымальнікаў і арандатараў, Саюза прадпрымальнікаў Беларусі растлумачылі дэпутатам свае задачы, планы, прапановы, накіраваныя на вывад краіны з крызісу, і тым самым дасягнулі сваёй мэты. Дэпутаты пераканаліся ў мэтазгоднасці, дасканаласці прапаноў, асабліва якія датычаць падаткаў. Хочацца верыць, што гэта сустрэча стане яшчэ адным крокам да аздараўлення эканомікі Беларусі.

***

12 лютага адбудзецца Асамблея прыватнага бізнесу, арганізаваная Саюзам прадпрымальнікаў Рэспублікі Беларусь і Беларускім фондам фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў, каб абагульніць вопыт прыватнага бізнесу, акумуляваць думкі, прапановы, знайсці новыя шляхі да развіцця прадпрымальніцтва ў рэспубліцы.

Цэц – на саломе

Пачала працаваць у горадзе Шкелене (Цюрынгія) першая ў Германіі цэц, якая выкарыстоўвае замест традыцыйнага бурага вугалю... салому. Такім чынам, ініцыятары гэтага праекта спадзяюцца значна паменшыць колькасць шкодных выкідаў у атмасферу. Гэты прыклад павінен стаць мадэллю для пераабсталявання ўсходненямецкіх ацяпляльных установак.

Раз катэдж, два катэдж

Узнікненне на ўскраінах Мінска шматлікіх катэджаў — праяўленне рыначных адносін у рэспубліцы. Напрыканцы 1992 года было каля 3000 участкаў, на якіх былі пабудаваны або закладзены індывідуальныя дамы. Зразумела, што набыць участак у 15—20 сотак і пабудаваць катэдж могуць толькі багатыя людзі. Паводле прагнозаў эканамістаў, у 2000 годзе ў Мінску будзе не менш як 5 працэнтаў сем'яў, якіх магчыма аднесці да багатых. Такім чынам, праз 6—7 гадоў каля беларускай сталіцы з'явіцца гарадок з 25000 асабнякоў.

Але чаму ўсё Мінск? А вось чаму. Як мяркуюць у Нацыянальным банку Рэспублікі Беларусь, у студзені мінулага года насельніцтва рэспублікі мела каля 150 мільёнаў даляраў, 100 мільёнаў з якіх асела ў Мінску. Як жа яны размеркаваны. 75 працэнтаў усіх валютных зберажэнняў мае 1 працэнт жыхароў сталіцы, а 80 працэнтаў апошніх не маюць іх увогуле. Цалкам у бягучым годзе ў Мінску будзе каля 60 сем'яў-мільянераў, а да канца стагоддзя — 5000. Трэба зазначыць, што ў 1993 годзе 30 сем'яў-мільянераў валодалі агульным капіталам у 112 мільёнаў даляраў, што больш сумарнага статутнага капіталу ўсіх камерцыйных банкаў рэспублікі.

У бліжэйшы час будзе расці попыт на пабудаваныя "пад ключ" катэджы, і цэны на іх застануцца высокія. Напрыклад, у 1993 годзе асабняк у 400м² каштаваў ад 65 да 200 тысяч даляраў. Цана залежыць ад размяшчэння будынка, арыгінальнасці праекта, якасці, паслуг сервісу і г.д.

Ва ўмовах развітога рынку да 80 працэнтаў катэджаў будзе куплена за ўласныя капіталы або пабудавана для сябе і за свае. Чвэрць гэтай лічбы — патэнцыяльныя пакупнікі з блізкага і далёкага замежжа. Тым не менш, 20 працэнтаў асабнякоў будуюцца за кошт доўгатэрміновых крэдытаў, атрымаць якія здольны толькі, так бы мовіць, "патрэбныя" людзі. Далібог, што загадала доўга жыць дзяржаўная праграма масавага будаўніцтва катэджаў, бо доўгатэрміновыя крэдыты на яе аплачваліся б за кошт падаткаў, а гэта значыць за кошт усяго (у большасці збяднелага) насельніцтва Беларусі.

Рыначная ж забудова ўскраін Мінска з гэтай прычыны сацыяльна справядлівая: ёсць грошы — купляй. Мясцовым уладам выгадна аддаваць нават сельскагаспадарчыя ўгоддзі пад катэджы. Тыя ж мяркуемыя 25000 багатых сем'яў здолелі б забяспечыць за кошт падаткаў на нерухомасць 400 тысяч пенсіянераў Мінска і Мінскага раёна, выплачваючы такім чынам штомесяц пенсію ў 15 даляраў.

"ПАС" — палітыка-аналітычная служба

НАТО зноў прыцягнула ўвагу

☐ Аляксандр ЛОЙКА

НАТО — ваенна-палітычная арганізацыя, якая была створана ў 1949 годзе. Штаб-кватэра блоку знаходзіцца ў Бруселі (сталіца Бельгіі). У яго ўваходзяць ЗША, Вялікабрытанія, Францыя, Бельгія, Нідэрланды, Люксембург, Канада, Італія, Партугалія, Нарвегія, Данія, Ісландыя, Іспанія, Турцыя, Грэцыя, ФРГ. Найбольшую ролю ў блоку адыгрываюць ЗША.

Краіны, што ўваходзяць у НАТО, маюць высокі жыццёвы ўзровень, які заснаваны на перавагах рыначнай эканомікі, крыніцы сыравіны і энергіі якой знаходзяцца на Блізкім Усходзе і ў іншых краінах трэцяга свету. Большасць усходнееўрапейскіх краін (Польшча, Венгрыя, Чэхія, Славакія, Румынія, Літва) была б не супраць далучыцца да такой элітарнай сістэмы. Аднак, з эканамічнага пункту гледжання, заходнія краіны не могуць дапусціць такой палёгкі, паколькі рэзка пагоршыцца сітуацыя (і цяпер не самая лепшая) на рынку іх працы, іх тавараў. Для гэтых краін на Захадзе бачаць больш рэальны шлях увязкі рыначных перамен у іх з эвалюцыяй Расіі як звышдзяржавы. Па сутнасці, гаворка ідзе пра выкарыстанне велізарнай крыніцы сыравіны, значнага прамысловага патэнцыялу, рынку.

Вяртанне да таталітарных традыцый у Расіі азначала б вялікую страту для Захаду, паколькі ізноў пачаўся б перыяд "халоднай" вайны, неабмежаваных ваенных затрат. Такім чынам, усходнееўрапейскія краіны разглядаюцца ў НАТО як тая сіла, якая павінна стварыць спрыяльныя геапалітычныя ўмовы для расійскіх рэформ. Аднак Польшча, іншыя краіны Цэнтральнай Еўропы асабліва не разлічваюць на поспех такога раскладу падзей і могуць пад ціскам абставін пайсці на стварэнне рэгіянальнага ваенна-палітычнага саюза. Тады НАТО прыйдзецца мець справу з новым блокам у Еўропе. Натуральна, блок не будзе мець значнай вайсковай сілы, але можа стаць ініцыятарам узнікнення яшчэ адной Еўропы, якая будзе здольна весці дыялог як з НАТО, так і з Расіяй. А тое, што адзінства такое неабходна, сведчаць падзеі ў Боснії. НАТО на апошняй сесіі фактычна прыняла рашэнне аб нанясенні паветранага ўдару па баснійскіх сербах, што блакіруюць Сараева — сталіцу Боснії.

Як бы ні развіваліся падзеі далей, але зразумела, што НАТО імкнецца захаваць свой элітарны статус, ролю назіральніка адносна розных рэгіёнаў свету. Вось толькі цэласнасць Еўропы пры гэтым не бярэцца пад увагу, паколькі занадта шмат увагі ўдзяляецца геапалітычным капрызам Расіі. У гэтым сэнсе Беларусь — адзіная краіна Еўропы, якая не пайшла насуперак планам Вашынгтона і Масквы. Расія ж для НАТО — і таямніца, і вялікая спакуса кантролю яе сродкамі над значнай тэрыторыяй Еўропы і Азіі.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА



Хатняя медсястра: ці патрэбна яна?

Нядаўна я скончыла курсы хатніх медыцынскіх сясцёр, якія даглядаюць хворых дома, робяць ім працэдуры ў хатніх умовах. Але яны, як бы мовіць, працуюць на грамадскіх пачатках. Было б вельмі нядрэнна, калі б хатняя медсястра атрымала афіцыйны статус. Колькі людзей, па розных абставінах, не могуць сёння лячыцца ў бальніцах, а ім так патрэбен догляд дома. Хатняя медсястра можа зрабіць унутрымышачную ін'екцыю, баночны масаж, паставіць дзіцяці кампрэсік на вушка ці памераць ціск.

Вядома, курсы не заменяць медыцынскага вучылішча, але, мяркую, што трэба "разгрузіць" нашых прафесійных медсястрычак у некаторым сэнсе. Калі вы, чытачы, зразумелі тое, што я хацела сказаць, калі вам патрэбна будзе медыцынская дапамога дома, — пішыце мне (адрас у рэдакцыі) ці званіце па тэлефонах: 46-48-04 і 64-80-91 вечарам.

Святлана ЧАРНАЯ.

Бывай, паравоз

Смяяцца, вядома, можа кожны. Здаецца, няма на зямлі чалавека, які б у сваім жыцці не пажартаваў або проста не ўсміхнуўся. Своеасаблівы гумар праявілі нядаўна і працаўнікі Асіповіцкага чыгуначнага вакзала. А пачыналася ўсё зусім звычайна...

З рэпрадуктара аб'явілі, што электрычка, якая ідзе да Мінска, прыбудзе на чацвёрты пуць. Усе пасажыры, як па камандзе, схапілі свае сумкі, чамаданы, рукзакі, самаробныя торбы і рынуліся наперад. Нібы і не было ніякага багажу — як лёгкія пушынкі, якіх гоніць вецер, ляцелі людзі, тоячы ў душы адну толькі думку: першым забегчы ў вагон і заняць зручнае месца. Маю ўвагу прыцягнуў голас з рэпрадуктара — заўжды сур'ёзная жанчына гаварыла так разгублена, быццам нешта ўтойвала. А калі наперадзе пачулася лаянка тых, хто быў лідэрам у гэтай гонцы за права першым зайсці ў электрычку, усё стала зразумела. Справа ў тым, што паміж пасажырамі і мінскай электрычкай стаяў доўгі таварны састаў. Як цягнік трапіў сюды, так і засталося загадкай. Можна ўявіць, што зрабілі б у такім выпадку ў цывілізаванай краіне, але наш народ не стаў чакаць, пакуль кіраўніцтва разбярэцца з недарэчнасцю. Навучаныя горкім вопытам і, магчыма, ужо не аднойчы трапляўшыя ў такія сітуацыі, пасажыры ведалі: спадзявацца на што-небудзь дарэмна...

Штурм пачаўся адразу. Праўда, найбольш інтэлігентныя і стрыманыя вырашылі проста абысці таварняк, толькі паспелі яны на электрычку ці не, я не ведаю, бо ж вы знаёмы з даўжынёй нашых таварных саставаў. Астатнія, пажадаўшы ім шчаслівага шляху, марнаваць час не сталі. Людзі з маленькімі дзецьмі пралазілі пад цягнікам, іншыя знайшлі сабе шчыліну паміж счэпленымі вагонамі: сумкі застравалі, нехта не ўтрымаўся і зваліўся, вакол — лаянка, крыкі і страх перад тым, што цягнік вось-вось можа паехаць. Яшчэ адна маленькая непрыемнасць адбылася тады, калі тыя, хто ехаў з Мінска, не паспеўшы выйсці, сутыкнуліся з тымі, хто яшчэ толькі збіраўся наведаць беларускую сталіцу, і палезлі ў вагон, не даўшы ўсім спусціцца. Але як толькі ўзбуджаныя пасажыры занялі свабодныя месцы, эмоцыі адразу сціхлі, і пра гэты маленькі эпізод з вакзальнага жыцця за размовамі аб палітыцы і эканоміцы ніхто так і не ўспомніў. А я ўсё не мог забыць адзін воклiч: "Што ж мы, не людзі?". Не, сапраўды, няўжо нельга было даць пасажырам магчымасць нармальна сесці ў электрычку або проста папрасіць прабачэння за нязручнасць пры пасадцы? Справа не толькі ў хамскіх адносінах, а ў тым, што здараюцца такія выпадкі ўжо надта часта і для нашага грамадства даўно не з'яўляюцца незвычайнымі. Але ж нам таксама паступова трэба прывыкаць да элементарных культурных зносін. Можа ўжо хопіць гэтай абыякавасці і раўнадушша да ўсяго, што адбываецца навокал?

Р.МІЦЮШНІКАЎ.

ЭКАНОМІКА

Дзе ж ён, бераг выратавання?

☐ Валянцін БАРЫСЕВІЧ,"ЧЗ"

Развал эканомікі выклікае не толькі катастрафічны спад вытворчасці, ён хваравіта ўплывае і на забеспячэнне людзей прадметамі шырокага ўжытку, паралізуе рух тавараабароту. Вось таму варта пазнаёміцца з пэўным вопытам тых, каму ўдаецца ўсё ж выжыць, быць на плаве ва ўмовах дзікага рынку.

Мінскаму вытворчаму абутковаму аб'яднанню "Прамень", канешне, да працвітання далёка, паколькі львіную долю прыбытку з'ядаюць празмерна высокія падаткі. На 50-60 працэнтаў павялічыліся апошнім часам цэны на сыравіну. Але і ў гэтай складанай эканамічнай сітуацыі тут не апусцілі рукі, не палі духам. Кінутыя на волю лёсу, не маючы пабочнай фінансавай падтрымкі, яны ўсё ж адшукваюць грашовыя сродкі і закупляюць сучаснае абсталяванне, паляпшаюць якасць абутку, расшыраюць яго асартымент. А ў канчатковым выніку ўсё гэта з'яўляецца нядрэннай процівагай унутранаму рынку, з яго няўстойлівай кан'юнктурай, высокай камерцыйнай рызыкай у абставінах эканамічнага хаосу і нястрымнай інфляцыі.

Згадзіцеся, вельмі спакусліва па-простаму перапрадаваць закупляемы оптам і ў розніцу ў магазінах Дзяржгандлю абутак, некаторыя мадэлі якога на сёння не ўступаюць імпартным узорам. Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова пабыць на тым жа стадыёне "Дынама" ў гадзіны, адведзеныя для дзікага кірмашу. Кошт на жаночыя боцікі, выраблены на абутковым аб'яднанні, тут у некалькі разоў перавышае стартавы. Перакупшчыкі розных масцей сёння за дзень кладуць у кішэню "кускі" і "лімоны". Аднак не толькі яны ўзвінчваюць цану на той жа абутак да завоблачных вышынь, шкодзячы таваравытворцам і насельніцтву. На павелічэнні цэн наварыстую юшку маюць і прадстаўнікі дзяржаўнага гандлю.

— Ці ж гэта справядліва? — абурался пад час гутаркі намеснік старшыні прафкама аб'яднання "Прамень" Маргарыта Уладзіміраўна Козіч. — Мы затрачваем энергарэсурсы, сыравіну, вырабам тых жа жаночых боцікаў заняты не адзін чалавек, а атрымліваем усяго дваццаць працэнтаў прагрэсіўкі. А ў гэты час, у прыватнасці, работнікі таго ж магазіна № 5, што па вуліцы Маскоўскай нашай сталіцы, нават пальцам не паварушыўшы, хіба толькі аплаціўшы за кіламетр транспартных выдаткаў, павялічваюць кошт на сто працэнтаў, і атрымліваюць у выніку за продаж нашага тавару сто працэнтаў прагрэсіўкі.

Не пагадзіцца з Маргарытай Уладзіміраўнай нельга. Сапраўды, у цану тавару можна "схаваць" усё, што хочаш, аж да абсалютнага разгільдзяйства, і тут жа атрымаць прыбытак і не менш "крутую" зарплату. А тое, што той жа селянін з далёкай правінцыі, які гадуе свіней, кароў і з'яўляецца адзіным пастаўшчыком сыравіны для гарбарных прадпрыемстваў, за свой жабрацкі заробак не можа купіць чаравікі сыну ці дачцэ, їх менш за ўсё хвалюе. Маўляў, пацерпяць! Толькі, відаць, памыляюцца тыя, хто гэтак думае. Пагалоўе як свіней, так і буйной рагатай жывёлы ў рэспубліцы катастрафічна скарачаецца. Калі так будзе прадаўжацца і ў далейшым, то хутка, бадай, давядзецца асвойваць даўнюю саматужную прафесію — плесці лапці з лыка.

Яскравае сведчанне таго, што вытворчасць скарачаецца, — наступныя лічбы і факты. Калі да перабудовы тут шылі дванаццаць мільёнаў пар абутку ў год, то цяпер усяго — восем. Многія цэхі з-за недахопу сыравіны тыднямі прастойваюць, у тым ліку і гарбарныя заводы ў Гатава, Бабруйску, фабрыкі, якія ўваходзяць у склад аб'яднання ў Маладзечна, Пухавічах, Уздзе. У апошніх (правінцыяльных гарадах) зрывы адбываюцца, як тлумачыў майстар Вадзім Іванавіч Сямёнаў, яшчэ з-за адключэння ў мэтах эканоміі ў пэўныя прамежкі часу электраэнергіі.

— Разбурылі вытворчасць, канечне, моцна, — падкрэсліла Тацяна Дзмітрыеўна Тыталь, вопытная рабочая, якая працуе ў аб'яднанні з 1957 года. — Мяркую аб гэтым з вышыні пражытых гадоў. Памятаю, амаль сорак гадоў назад мы выраблялі за змену 760 пар абутку, а сёння іншы раз і гэтай лічбы не дасягаем. Відаць, цяперашнія дэмакратычнікі мяркуюць так: ачуняе аб'яднанне — добра, а калі не — не бяда...

Гэтак ці не так думаюць пра спад вытворчасці ў вышэйшых эшалонах улады — меркаваць не буду. Зрэшты, не чакае каля мора пагоды і генеральны дырэктар вытворчага аб'яднання "Прамень" Вячаслаў Браніслававіч Вернікоўскі. Усведамляючы тое, што на прадпрыемствах аб'яднання выробляецца да трыццаці працэнтаў беларускага абутку, ён шукаў выйсце са становішча. І яно было знойдзена.

Недарэмна ж кажуць, лепшы спосаб навучыць чалавека плаваць — кінуць яго ў рэчку. Паплёскаецца і — паплыве. Некаторыя асцерагаюцца: а раптам патоне? Трэба ўсё ж спачатку навучыць, а пасля ўжо кідаць. Перабудова якраз не вучыла нікога плаваць. Кінула ў бурлівае мора дзікага рынку прадпрыемствы і самаўхілілася. Некаторыя патанулі адразу, іншыя — з цягам часу, апошнія, шукаючы паратунку ў новых эканамічных умовах, адшукалі бераг выратавання ў наладжванні дзелавых сувязяў з Захадам. Вось і аб'яднанне "Прамень" за кошт экспарту неўзабаве перайшло на валютную самаакупнасць.

Дырэктар аб'яднання, здаецца, быў адным з першых, хто даплыў да таго выратавальнага берага, зразумеў, што правільна арганізаваць вытворчасць — гэта значыць стварыць спрыяльныя ўмовы для рабочых, павялічыць пакупніцкую здольнасць вырабаў. Менавіта з гэтай мэтай і былі заключаны кантракты з Італіяй на пастаўку камплектуючых, абсталявання. А дзякуючы экспарту боцікаў у Канаду, Італію, Германію, Англію прадпрыемства неўзабаве атрымала магчымасць набываць хімічныя матэрыялы для вырабу поліўрэтану, высакаякасных клеяў, новыя тэхналогіі і запчасткі для абсталявання. І вось "Прамень" ужо на працягу пяці гадоў займае адно з вядучых месцаў сярод абутковых прадпрыемстваў СНД па якасці і попыту на прадукцыю.

Аднак жыццё ўносіць свае карэктывы. Сёння перад кіраўніцтвам аб'яднання паўстаюць усё новыя задачы: зберагчы калектыў, традыцыйныя гаспадарчыя сувязі, пашырыць кантакты з фірмамі, каб на кампенсацыйнай аснове цалкам адновіць вытворчасць і, вядома ж, развіваць сацыяльна-бытавую сферу, пашыраць сетку фірменных магазінаў, каб абараніць інтарэсы калектыву, прадаваць абутак без пасрэднікаў і тым самым задаволіць попыт насельніцтва ў больш танным таварах. Карацей кажучы, праблем больш чым дастаткова.

Канешне, з такім калектывам, а працуе ў аб'яднанні каля 7 тысяч чалавек, сярэдні ўзрост — 32 гады, можна горы перавярнуць. Але ж жыццё штодзень уносіць свае карэктывы, часам не залежачыя ад тых жа Лідзіі Васільеўны Цяшкевіч — начальніка 3-га цэха, нарыхтоўшчыцы верху абутку, маладых працаўніц Алы Гарнашэвіч, зборшчыцы дэталяў Любові Алексіеўніч, ветэранаў аб'яднання Марыі Мітрафанаўны Іклановіч, Надзеі Міхайлаўны Зарэмба, Арыны Уладзіміраўны Паповай і Любові Міхайлаўны Смолік. Наша эканамічная навука па-ранейшаму развіваецца "з аглядкай на Маскву": крок управа, крок улева разглядаецца як спроба ўцёку... Ці не адсюль і ўсе беды: рост беспрацоўя, інфляцыя, збяднене насельніцтва?

Вось і варацца калектывы, як кажуць, у сваім саку. Канешне, дырэктар аб'яднання "Прамень" Вячаслаў Браніслававіч Вернікоўскі не можа абяцаць тагр, што заўтра ўсе рабочыя прачнуцца багатымі, але тое, што яны ніколі не будуць забытымі — гэта дакладна. Праўда, сярод некаторых ветэранаў існуе няўпэўненасць у заўтрашнім дні. Калі я пацікавіўся ў майстра Вадзіма Іванавіча Сямёнава, як расцэньвае ён палітыку ўрада па ўваходу ў адзіную рублёвую зону, той, доўга не задумваючыся, адказаў: "Адмоўна. У Расіі ёсць нямала мільянераў, якія такое аб'яднанне, як наша, могуць выкупіць разам з усімі трыбухамі, а людзей — на вуліцу".

Што ж, прыклад з Расіяй, дзе львінай доляй сродкаў вытворчасці сапраўды па-ранейшаму распараджаецца адміністрацыйна-камандная сістэма, павучальны. Там простыя людзі — вытворцы — не могуць выйсці на рынак. Скупіўшы ваўчары, а праз іх — сродкі вытворчасці, былыя адміністратары скупляюць ужо рабочыя рукі.

На большасці абутковых прадпрыемстваў, дзе мне даводзілася пабываць, у тым ліку на гродзенскай фабрыцы "Нёман", рабочыя, ІТР схільныя да арганізацыі закрытых акцыянерных таварыстваў вытворцаў, дзе ўвесь прыбытак у канцы года размяркоўваўся б самімі акцыянерамі-вытворцамі. Але жыццё паказвае, што ўсе "рэформы" ў рэспубліцы накіраваны хутчэй толькі на эканамічную і палітычную свабоду адміністратараў і яшчэ большае зняволенне працаўнікоў: рабочых, служачых і сялян. Усё, што перашкаджае гэтай галоўнай мэце "рэформ", супярэчыць інтарэсам новай дзяржбюракратыі і наваяўных нуварышаў, — адмятаецца.

А, між тым, варта б пераняць вопыт у тых жа амерыканцаў, дзе ўрад выкупляе прадпрыемствы ў капіталіста і перадае іх у крэдыт працоўным калектывам. У прыватнасці, на сёння там каля 30 мільёнаў вытворцаў маюць акцыі з правам голасу на сваім прадпрыемстве. Працоўныя калектывы там, за акіянам, актыўна ўдзельнічаюць у кіраванні вытворчасцю, кантралююць прыбыткі і расходы прадпрыемства. У выніку народныя фабрыкі, заводы паспяхова канкуруюць на рынку з прадпрыемствамі, дзе ўсе служачыя і рабочыя з'яўляюцца наёмнікамі. Ды й прадукцыйнасць працы на гэткіх заводах, фабрыках на 50 працэнтаў вышэйшая, чым на капіталістычных.

Вось таму, на мой погляд, бераг выратавання для нашай эканомікі — у стварэнні менавіта народных прадпрыемстваў, закрытых акцыянерных таварыстваў вытворцаў. Зрэшты гэтую ідэю падтрымліваюць большасць рабочых, у тым ліку і на вытворчым аб'яднанні "Прамень". Калі мы ўжо ўзяліся будаваць рыначную эканоміку, дык няхай людзі будуць свабоднымі вытворцамі, гаспадарамі сваіх прылад працы і свайго прыбытку. Толькі тады на паліцах нашых магазінаў з'явіцца больш таннага і якаснага абутку з маркай "Нёман", "Прамень", "БелВест".

А пакуль... Пакуль адміністрацыя мінскага вытворчага аб'яднання "Прамень" умацоўвае сувязі з краінамі далёкага замежжа. Так, сумесна з Бабруйскім гарбарным камбінатам і прэзідэнтам германскай фірмы "Сан-Манга" заснавана сумеснае прадпрыемства, дзе будзе выробляцца мужчынскі і жаночы абутак на экспарт і для рэалізацыі на тэрыторыях рэспублікі, краін блізкага замежжа. Вядуцца перамовы з Турцыяй аб стварэнні прадпрыемства па пашыву спартыўнага абутку.

Што ж, жыццё ідзе.

...Пад шэрым зімовым небам цёмная вуліца з сярэдневяковай назвай — Няміга. Спускаюся па каменных прыступках ад праходнай. І вось ужо за плячыма, нібыта ветразь, адміністрацыйны будынак. Адсюль, з пагорка ад вуліцы Валадарскага, тэрыторыя прадпрыемства бачыцца мне караблём з ветразем. Сёлета, улетку, аб'яднанне будзе святкаваць сваё 70-годдзе. Да якога ж берага, да якой пристані прычаліць карабель з 7000 весляроў і яго капітанам Вячаславам Браніслававічам Вернікоўскім, — пакажа час.

ПРАВІНЦЫЯЛЬНАЯ ХРОНІКА

За праезд –валюту!

Дэпутаты ДУБРОВЕНСКАГА райсавета даручылі выканаўчай уладзе распрацаваць палажэнне аб аплаце за транзітны праезд па тэрыторыі раёна. Брацца яна будзе ў свабодна канверсуемай валюце.

Доўгія чэргі на граніцы з Расіяй і значны паток аўтамабіляў на трасе Мінск—Масква патрабуюць вялікіх фінансавых укладанняў для ўтрымання дарог. Менавіта на гэтыя мэты і пойдуць "зялёныя".

БЕЛІНФАРМ.

Немцы думаюць пра Беларусь

ХОЙНІКІ. Жыхары горада і раёна ўжо добра ведаюць нямецкіх сяброў з горада Памара зямлі Паўночны Рэйн–Вестфалія.

Як паведаміў старшыня Фонду міру Беларусі М.Ф.Ягораў, з Германіі для патрэб раёна ўжо атрыманы два транспарты з гуманітарнай дапамогай: медыкаментамі, медыцынскім абсталяваннем, харчовымі прадуктамі. А нядаўна бацькоўскі камітэт "Дапамога дзецям Чарнобыля" з Ламара выступіў з прапановай пачаць збор сродкаў на куплю двух аўтобусаў для Хойнікаў і знайсці спонсараў для будаўніцтва ў райцэнтры станцыі тэхнічнага абслугоўвання. Гэта выклікана тым, што дэлегацыя бацькоўскага камітэта на чале з баранесай Развітай фон Каркап, якая пабывала ў Хойніках, пераканалася, што ў палескай глыбінцы вельмі востра адчуваецца недахоп транспарту і бачны дрэнныя зносіны райцэнтра з аддаленымі вёскамі. Для абмеркавання пытанняў вышэйпамянёнай дапамогі ў канцы студзеня Хойнікі чакаюць прыезду яшчэ адной нямецкай дэлегацыі.

А.СЦЯПАНАЎ.

У "Батлейцы" – прэм'ера

Мінскі абласны тэатр лялек "Батлейка", якім кіруе Сяргей Фёдаравіч Юркевіч, можна назваць сапраўдным асяродкам беларускасці, цэнтрам беларускай культуры ў Маладзечна.

Кожны спектакль, пастаўлены тут, адразу робіцца значнай падзеяй у культурным жыцці горада. Вось і паэтычная казка Валянціна Лукшы "Чароўны камень", прэм'ера якой нядаўна адбылася, стала такой падзеяй, бо мяркуючы па рэакцыі дзяцей, што сабраліся ў зале, спектакль ім вельмі спадабаўся. Гэта — не першая творчая ўдача маладога рэжысёра. І, трэба спадзявацца, не апошняя.

Хрысціяне пра секс...

У Жлобіне прайшла аднадзённая рэспубліканская канферэнцыя па праблемах евангелізацыі нашага грамадства.

Абмеркаваць набалелыя праблемы ў горад на Дняпры з'ехаліся пастары і члены хрысціян веры евангельскай з Мінска, Гомеля, Пінска, Рэчыцы, Мазыра, Жыткавічаў, многіх іншых мясцін Беларусі. Расію прадстаўляла абшчына хрысціян-евангелістаў з Геленджыка.

"Роля і месца пастара ў дзейнасці абшчыны", "Значэнне малітвы ў жыцці веруючага", "Моладзь і секс" — так гучалі асноўныя тэмы канферэнцыі.

Мікалай ШУКАНАЎ.

Дзе тэатральная сталіца?

Пра стварэнне ў Наваполацку тэатра–студыі "Зніч" чулі ўжо многія. А чым жыве тэатр сёння?

Калі не лічыць сольных канцэртаў зорак полацкага рэгіёна дома і на выездзе, дык галоўнай прыкметай цяперашняга "знічаўскага" жыцця з'яўляецца падрыхтоўка прэм'еры арыгінальнага "афіцэрскага канцэрта" — музычнага спектакля, дзе неверагодная дзея адбываецца на мяжы Беларусі з Польшчай дзесьці ў 1919-20 гадах.

Спектакль мае назву "Эміграцыя, альбо Гульня на звонкі". Ягоная прэм'ера плануецца прыкладна напрыканцы студзеня або ў пачатку лютага. Удзел прымуць такія папулярныя выканаўцы, як Ален, Аніса, Таццяна Макарава, Сяргей Казлоў.

Бадай, Наваполацк хутка сапраўды стане сталіцай нацыянальнага маладзёжнага тэатральнага жыцця. Прынамсі сёння на імпрэзы тэатра-студыі "Зніч", які яшчэ мала гастралюе, яздзяць ужо і з Віцебска, і з Мінска, і з іншых мясцін Беларусі.

Вітаўт МАРТЫНЕНКА, "ЧЗ-інфарм"

БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Асімілёўвалі гвалтам. А як адрадзіцца?

(Пачатак у № 7,8)

3.Адраджэнню дзяржаўную падтрымку

Сёння нам патрэбны не рэферэндумы, плебісцыты, выбарачныя сацыялагічныя даследаванні, а навукова абгрунтаваная дзяржаўная палітыка ў галіне мовы. І калі дзяржаўныя органы ўлады і кіраванне ледзь не на ўсе сто працэнтаў правялі культурнамоўную асіміляцыю беларускага народа, цяпер жа святы абавязак такіх органаў вярнуць яго да сапраўднага нацыянальнага жыцця, што магчыма толькі праз поўнае гарантаванне беларускай мове статуса адзіна дзяржаўнай на яе гістарычнай тэрыторыі. Не будзем забываца, што ўсе нашы нацыянальныя беды пачыналіся з занядбання роднай мовы, пагарджання ёю. За рэдкім выключэннем мы ўвесь час былі вельмі дранными вучнямі свайго выдатнага настаўніка Францішка Скарыны, які па-прарочы папярэджваў: "Не многим учителем бывати, но более умети язык свой справовати, от него же все злые и добрые речи походят". Дык давайце ж хоць цяпер так "справовати" сваю родную мову, каб ад гэтага мець толькі "добрые речи".

Радуе, што сям-там усё ж пачалі так "справовати", да чаго нас абавязвае Закон аб мовах. Яго прыняцце — гэта вялікая перамога і адначасова не меншая трагедыя. Трагедыя таму, што дзеля выратавання беларускай мовы на яе ж уласнай гістарычнай тэрыторыі не знайшлося іншага дзейснага сродку, акрамя спецыяльнага нарматыўнага акта. Такія акты ў нас больш лагічна было б уводзіць у дачыненні да рускай, польскай, украінскай, яўрэйскай ці іншых моваў, гістарычныя тэрыторыі якіх ляжаць па-за межамі Беларусі. У Расіі ж, Польшчы, Германіі, Італіі альбо іншых суверэнных краінах не існуе падстаў для прыняцця законаў аб ахове дзяржаўных моваў, іх карэннага насельніцтва. І не існуе таму, што там нацыянальна-культурнае развіццё яго адбываецца ў нармальным рэчышчы, без усялякіх дэфармацый.

Бадай, не было ў нашай гісторыі выпадку, як з Законам аб мовах, каб такая заўзятая барацьба — адкрытая і патаемная — вялася з ужо прынятым дзяржаўным заканадаўчым актам, прычым нават і з боку саміх народных дэпутатаў, у тым ліку і рэспубліканскага ўзроўню. Дзеля справядлівасці адзначу, што розныя формы ігнаравання беларускай мовы, асабліва ў дзяржаўных сродках масавай інфармацыі, мелі месца яшчэ на самым пачатку сучаснага нацыянальна-культурнага Адраджэння. Але найбольш актывізаваліся яны ў гэтым напрамку пасля прыняцця Закона аб мовах, на што проста не маглі не звярнуць увагі ўдзельнікі II з'езда рэспубліканскага Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны, які праходзіў у чэрвені 1991 года. Вось якую ацэнку далі яны пазіцыі сродкаў масавай інфармацыі ў сваім Звароце да грамадзян Беларусі: "Вельмі слаба асвятляе чарговую "беларусізацыю" на сваіх старонках рэспубліканскі друк. Мала таго, у некаторых выданнях з'явіліся зневажальныя публікацыі ў адносінах да нашай мовы, дзеячаў беларускай культуры, пісьменнікаў. Ні ў адной краіне народ не дазволіў бы, каб так ахайваліся яго святыні, лепшыя прадстаўнікі нацыі. Гэта толькі цярплівыя беларусы могуць зносіць такое. Але далей так жыць нельга!"

Не пагаджаюся толькі з апошнім сказам цытаты, бо практыка паказала, што беларусы так жыць могуць. Пасля ўпамянутага з'езда ТБМ дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі былі яшчэ больш агрэсіўнымі, вялі яшчэ больш вытанчаную барацьбу з беларусізацыяй і яе асноўным кампанентам — мовай, а беларусы ўсё ж неяк жывуць і, напэўна, надалей будуць жыць, трываючы любое стаўленне да іх праціўнікаў беларускай нацыянальнай ідэі, якія так бязлітасна злоўжываюць цярплівасцю яе носьбітаў. Такімі, відаць, само жыццё зрабіла нас. Нездарма нядаўна паэт Алесь Звонак пісаў пра нашага брата, што ён "дабрынёй сваёй грашыць чуток!"

Дабрыня, талерантнасць, памяркоўнасць — усё гэта вельмі станоўчыя якасці чалавека, але толькі не для любых сітуацый. Быць добрым, талерантным, памяркоўным з тымі, хто прапаноўвае нам ідэю дзяржаўнага двухмоўя, якая немінуча прывядзе да рускага аднамоўя, — гэта значыць капаць дол, калі не сёння-шнім, дык заўтрашнім пакаленням беларусаў. Таму лепш пакінем вышэйадзначаныя якасці беларускага народа для іншых сітуацый, а што датычыць увядзення афіцыйнага двухмоўя, дадзім яму сапраўдны бой, зразумела, не рукапашны і крывавы, а ідэйна-ідэалагічны. Будзем вяваць з гэтай пачварнай з'явай цывілізаванымі метадамі і асабліва дружна выступім у абарону роднага слова, калі нам усё ж навяжуць рэферэндум па дадзенаму пытанню. Не паддавайся, дарагі народзе, на кручок, што дзяржаўнае двухмоўе не пагражае тваёй роднай мове. Такога іспыту не вытрымае ніводная нацыя. Каб такое было магчымым, на падобны шлях ужо даўно сталі б многія народы. Яны ж не ідуць на падобны варыянт з-за боязі страціць родную мову. Няцяжка ўявіць, што сталася б з рускай мовай, калі б на велізарнай прасторы Расійскай Федэрацыі статус дзяржаўнай надалі яшчэ і англійскай, ці каб у Польшчы ў такі ж ранг узвялі французскую мову.

Кожная незалежная дзяржава канстытуцыйна абараняе сваю мову ад непатрэбнай і заўсёды вельмі небяспечнай канкурэнцыі з боку іншых моваў і не лічыць нават лішнім прыняць шэраг адпаведных нарматыўных актаў з мэтай забеспячэння нармальнага функцыяніравання першай. І тут усё лагічна: дзяржава сваім нараджэннем абавязана нацыі, таму і клапоціцца пра яе лёс. Штосьці робіца і ў нас: у ліпені 1990 года беларуская нацыя сваёй сімвалічнай дзяржаве БССР

Дзевятае неба

Кітайцы ў космасе

Другі Азіяцка-ціхаакіянскі спадарожнік будзе запушчаны пры дапамозе ракеты-носьбіта "Чанчжэн-2" у кастрычніку-снежні 1994 года з кітайскага касмадрома Січан.

Кантракт аб гэтым камерцыйным запуску спадарожніка падпісалі кітайская генеральная прамысловая кампанія "Чанчэн" ("Вялікая сцяна") і азіяцка-ціхаакіянская кампанія спадарожнікавай сувязі, што знаходзіцца ў Сянгане (Ганконг).

Сцеражыся інфаркту!

Берлінскія медыкі правялі даследаванні шматлікіх выпадкаў інфаркту сэрца, якія пачасціліся апошнім часам.

Як сведчыць статыстыка, інфаркт часцей за ўсё адбываецца ў курыльшчыкаў, а таксама ў людзей, якія храпуць у час сну. У асноўным інфаркты адбываюцца раніцай, асабліва перад самым пад'ёмам ці за снеданнем.

Загінулі дзеці

Чацвёра дзяцей былі забіты і 11 паранены ў нядзелю ў выніку выбуху снарада ў харвацкай частцы горада Мастар, у паўднёва-ўсходняй Боснії.

Дзеці (самаму маленькаму з іх было 5 гадоў, а старэйшаму 14) гулялі на дзіцячай пляцоўцы, калі адбылося нападзенне, у якім падазраюцца мусульманскія баевікі.

Людзі супраць мядзведзяў

У горнай частцы ЗША цывілізацыя ўступіла ў канфлікт з папуляцыяй чорных мядзведзяў, паколькі асноўныя месцы размяшчэння гэтых рэдкіх жывёлін з'яўляюцца першакласнымі ўчасткамі для пабудоў.

Людзі ставяць пасткі і перасяляюць у іншыя месцы да сотні чорных мядзведзяў у год. Але часцяком яны не спрацоўваюць — і мядзведзі вяртаюцца назад. Пад націскам грамадскасці мясцовыя ўлады вымушаны мяняць правіла разаўцця гэтага раёна

АПЛАДЫСМЕНТЫ

Музыка вакол нас

Беларускі прафесійны "Super-top-93"

Агенцтва "ЧЗ-інфарм" правяло апытанне вядучых музычных крытыкаў Беларусі па 17-ці намінацыях нацыянальнай поп-музыкі за мінулы год. Экспрэс-агляд гэтага гіт-парада прапануе наступная публікацыя.

Найперш паведамім імёны тых, чыя думка дазволіла скласці пэўную аб'ектыўную карціну. Бадай, гэта імёны, якія могуць гарантаваць кампетэнтнасць: Юры Рашэтнікаў, музычны рэдактар Беларускага радыё; Аксана Лявіцкая, музычны рэдактар Беларускага тэлебачання; Віталь Сямашка, рэдактар радыёстанцыі "Беларуская маладзёжная"; Вітаўт Мартыненка, аглядальнік газеты "Чырвоная змена"; Анатоль Мяльгуй, музычны крытык; Макс Івашын і Дзмітрый Эпштэйн, музычныя аглядальнікі газеты "Знамя юности" ды шэраг іншых.

Такім чынам, што прыкмецілі гэтыя асобы за мінулы год у беларускай поп-музыцы самае лепшае, самае ўразлівае і... самае горшае.

ВЫКАНАЎЦА-93

1. "Крама".
2. "Уліс".
3. "Палац".
4. "Мроя".
5. "Зіндан".

Бадай, усе імёны шырока вядомыя: каго рэгулярна круцяць па радыё ды тэлебачанні, а хто хоць не дома, а да мяжой, але здолеў наладзіць уласную дыскаграфію. Як бы ні было, але творчая актыўнасць і прафесіяналізм дазволілі ім стаць лідэрамі. Гэта не дзіўна. Хутчэй, дзіўна бачыць іх сярод узыходзячых зорак у раздзеле

АДКРЫЦЦЕ-93

Тут зноў называюць "Палац", а следам за ім "Алена", К.Гарачага, А.Свірыдаву, Стэфані.

Зразумела, тут яўна розныя вагавыя катэгорыі, бо як параўнаць салідную раскрутку "Палаца" па ўсіх шоу-каналах і таго ж "Алена", які рэгулярна гучыць хіба толькі ў альтэрнатыўным радыёэфіры беларускай праграмы радыё "Свабода". Ну што ж, тым больш гонару для пачаткоўцаў.

ПЕСНЯ-93

1. "На далоні" ("Уліс").
2. "Светлы анёл" ("Крама").
3. "Ой рана-рана" ("Палац").
4. "Стэфка" ("Крама").
5. "Віно і хлеб" ("Мроя").

Песенная намінацыя толькі пацвярджае шчырасць і аб'ектыўнасць нашых спецыялістаў: з 60 названых твораў нацыянальных зорак лідэрамі сталі песні тых, хто сапраўды з'яўляецца безумоўным лідэрам. Гэта пацвярджае і намінацыя "ШОУ-АРТЫСТ-93", дзе вызначыліся такасама І.Варашкевіч, Л.Вольскі, С.Краўчанка. А вось з "ШОУ-АРТЫСТКАМІ-93" крыху іншая сітуацыя: калі Нэлі Дзянісава прадстаўляе сабой вызначаны раней "Зіндан", дык раздзяліўшая з ёй лідэрства Кася Камоцкая хоць і прадстаўляе "Новае неба", але атрымалася як бы сама па сабе, накшталт ідучых па пятах Іны Афанасьевай, Вальжыны Цярэшчанка і Алены Свірыдавай.



БАС-ГІТАРЫСТ-93

1. Сяржук Краўчанка ("Уліс").
2. Руслан Праўда ("Крама").
3. Міхась Шупенька ("Спірыт").

ГІТАРЫСТ-93

1-2. Вячаслаў Корань ("Уліс"), Віктар Смольскі ("Мроя").
3. Янка Маркаў ("Лімп Блюз Бэнд").

ВАКАЛІСТ-93

1. Ігар Варашкевіч ("Крама").
2. Валеры Дайнека.
3. Лявон Вольскі ("Мроя").

Намінацыі Інструменталістаў, па сутнасці, пацвярджаюць прэстыж лідэраў, але ў асобных выпадках вызначаюць і новыя імёны ("Спірыт"), узгадваюць заслугі старых (экс-"песняровец" Дайнека, экс-"бондавец" Маркаў). Праўда, у абодвух выпадках інструменталістаў вызначае сённяшняя актыўнасць.

Вось, скажам, сярод лепшых БАРАБАНШЧЫКАЎ-93 названы і Анатоль Горбач ("Крама"), і Сяржук Кныш ("Уліс", экс-"Бонда"), і Алесь Суворавец ("Спірыт").

Разглядаліся ў апытанні і такія намінацыі, як "КАНЦЭРТ-93", "ТЭЛЕ-..." і "РАДЫ�ё-ШОУ-93", "МУЗЫЧНАЯ ПРЭСА-93", але хоць і дало гэта сваю групу лепшых, але лёгка апынуцца, як кажуць, у тройцы лідэраў сярод трох удзельнікаў. Што ні кажыце, мала яшчэ ў нас і прыкметных канцэртаў, і музычнай прэсы. Нядзіўна таму, што гастролі брытанскай супер-групы (калі на мерку 60-70-х гадоў) "Sweet" у Мінску трапілі і ў разрад лепшых канцэртаў, і ў лік "РАСЧАРАВАННЯЎ-93".

Намінацыя "МУЗЫЧНЫ КРЫТЫК-93" паказала толькі, што самі ўдзельнікі апытання вельмі ўважліва чытаюць адзін аднаго. Ніякіх новых асобаў да рангу сваіх калегаў яны ў мінулым годзе не далучылі. Мо і сапраўды не было з каго?

ПАДЗЕЯ-93

1. Кампакт-дыск "Крамы" ў Англіі.
2. "Палац".
3. "Дзень "Снікерсу" і рок-н-рола".

На падзеі мінулы год быў усё ж багаты. І на падзеі не простыя, а этапныя. Дзіўна толькі, чаму ў вачах спецыялістаў сціплая імпрэза са "Снікерсамі" захіліла гастролі беларускага гурта "Уліс" у Вялікабрытаніі?

Багатым быў год і на расчараванні: гэта і згаданыя вышэй супер-зоркі ("Sweet", "Boney M"), якія сталі даваць у нас канцэрты для фанаў, крутыя клёшы і блішчастыя куртکі якіх даўно зляжаліся пад нафталінам; гэта і славуты "Славянскі базар", які заняў тут першае месца, бо не кожны ж фэст з гэткай стабільнасцю абыходзіцца без адкрыццяў; гэта і маленькія расчараваннейкі ў тым, што распаўся гурт "Мясцовы час", нічога новага не знаходзіць "Отражение", не здолеў стаць заменай "Нямізе" рок-клуб У.Зайчанкі...

Вось і ўсе 16 намінацый. Застаецца толькі дадаць, што 17-я была прысвечана не беларускай музыцы, а сусветнай. Яна хіба здзівіла, што лепшымі замежнікамі спецыялісты нашыя лічаць "Нірвану", "Экстрым", Стынга, а на радыё і ў прэсе ўсё часцей сустракаем з іхняй дапамогай "Любэ". Жэню Белавусава і г.д.

Як бы тое ні было, але апытанне адбылося і мо дапаможа і нам усім лепш арыентавацца ў музыцы, што вакол нас.

Ад Дзяржаўнай камісіі па ўдакладненню правапісу беларускай літаратурнай мовы

Камісія завяршыла першы этап работы і выносіць на разгляд грамадскасці свае прапановы па зменах у правапісе. Як і трэба было чакаць, найбольш спрэчак і разыходжанняў сярод членаў камісіі выклікала пытанне аб правапісе мяккага знака: выпрацаваны аж чатыры варыянты яго пашырэння ў пісьме. Паколькі пытанне асабліва важнае, камісія і прапануе ўсе чатыры ўвазе тых, хто мае намер прыняць удзел у абмеркаванні правапісу. Усе астатнія прапановы аб зменах у правапісе былі прыняты на пасяджэннях камісіі аднагалосна ці амаль аднагалосна.

Адрасуючыся да грамадскасці, хацелася б нагадаць, што само пытанне аб удакладненні правапісу нашай літаратурнай мовы не надуманае і не кімсьці навязанае, як гэта здаецца, міркуючы па лістах у камісію, некаторым шаноўным грамадзянам. Яно ўзнікла таму, што нельга далей пакідаць па-за ўвагай той разнабой у мове друку, радыё і тэлебачання, які выразна абазначыўся і набывае ўсё большыя маштабы. У грамадскай моўнай практыцы ўсталёўваецца свавольства і хаос, што вельмі згубна адбіваецца на агульным узроўні пісьменнасці ў краіне, не кажучы пра тое, што гэта не робіць нам, грамадству і дзяржаве, гонару. Не можа не выклікаць шкадавання, што рэакцыя на палітычную тэндэнцыйнасць рэформы правапісу 1933 года штурхае некаторых грамадзян у другую крайнасць, калі таксама выяўляецца відавочная тэндэнцыйнасць, толькі з процілеглым знакам. А трэба ў гэтай справе кіравацца прынцыпамі навуковасці, эстэтычнасці (мілагучнасці), павагі да традыцый, натуральнасці маўлення, даступнасці авалодання і зручнасці карыстання літаратурнай мовай. Іменна гэтым кіравацца ў размове аб правапісе і заклікае камісія.

Заўвагі і водгукі просім выказаць у друку, а таксама прысылаць у камісію на адрас: 220016, г.Мінск, вул.К.Маркса, 38, Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Камісія па адукацыі, культуры і захаванню гістарычнай спадчыны. Тэрмін — да 1 красавіка 1994 г.

Вынікавы дакумент Дзяржаўнай камісіі па ўдакладненню правапісу беларускай літаратурнай мовы

На абмеркаванне грамадскасці выносяцца наступныя варыянты правапісу змякчальнага мяккага знака.

1а. Пашырыць напісанне змякчальнага мяккага знака і даць наступную фармуліроўку п. 26 87 "Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі" (Мн., 1959):

"Мяккі знак пішацца перад суфіксам *-ск-* у прыметніках і ўласных імёнах, утвораных ад назоўнікаў, якія канчаюцца мяккім *н*: *студзеньскі, чэрвеньскі, ліпеньскі, восеньскі, коньскі, Смаргоньскі (раён), Быценьскі, Блоньскі, Чэрвеньскі, Любаньскі, "Радуньскі" (калгас)*".

Мяккі знак пісаць таксама пасля прыставак, якія канчаюцца на *з*, перад *е, ё, ю, я* і націскным *і*: *зьезд, зьёрзаць, разьюшаны, зьялізаць, зьнець.*

1б. Пашырыць напісанне змякчальнага мяккага знака і даць наступную фармуліроўку п. 26 (87) "Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі":

"Мяккі знак пішацца перад суфіксам *-ск-* у прыметніках і ўласных імёнах, утвораных ад назоўнікаў, якія канчаюцца мяккім *н*: *студзеньскі, чэрвеньскі, ліпеньскі, восеньскі, коньскі, астраханьскі, Смаргоньскі, Быценьскі, Блоньскі, Чэрвеньскі, Любаньскі, "Радуньскі" (калгас)*".

П.З 86 даць у наступнай фармуліроўцы:

"Мяккі знак пішацца для абазначэння мяккасці зычных *з, с, ц, дз* перад наступным мяккім зычным: *сьнег, сьнедаць, прозьвішча, барацьбіт, зьвінець, радасьць, сьціхаць, лазьня, зьмена, зьлезьці, цьвік, цьвісьці, цьмяны, дзьверы, дзьве, будзьце, шэсьць, штосьці, ледзьве, пісьменнік, васьмі, усьміхацца, паўзьверх, паўзьмены, зьява, зьёрзаць, разьезд.*

Аднак мяккі знак не пішацца:

пасля зычных перад мяккімі *к, г, х*: *скінуць, скіраваць, скірда, маскіроўка, раскідаць, раскідзаць, згіб, разгінаць, разгерметызаваць, схіліць, схіліцца, расхінуць*, а таксама ў словах перад *г, к, х* — пасля цвёрдых зычных: *брызгі, польскі;*

у канцы прыназоўнікаў, якія канчаюцца на *з*, перад мяккімі зычнымі: *без мяне, без людзей, паўз лес, паўз лінію, з некім, з лесу, з ёй (іой), з імі (імі);*

паміж літарамі, якімі перадаецца падаўжэнне зычных, а таксама паміж прыставачнымі і карэннымі *с, з*: *насенне, заданне, ралля, галлё, палозье, калоесе, ліццё, суддзя, ссекчы, ссінець, ссесыціся, рассяліць, бяссільны, бяссьмерце, бяссьледны, бяссьнежны, ззелянець, беззямельны, беззьмястоўны, бяззьменны*; не пішацца мяккі знак пасля *з* у словах *ззяць, ззянне.*

1в. Абазначаць у межах слова памякчэнне зычных *з, с, дз, ц* мяккім знакам перад мяккімі зычнымі (акрамя *г, к, х*) і ётавымі галоснымі: *зьвер, лазьня, прозьвішча, сьнег, сьпяваць, у масьле, радасьць, дзьверы, цьвік, зьехаць, зьява, разьюшыцца, зьёрзаць.*

Мяккі знак пісаць таксама пры абазначэнні мяккіх падоўжаных (падвойных) зычных: *ралля, пытаньне, палозьзе, Палесьсе, сваць-ця.* Падоўжанае (падвойнае) *дз* перадаваць праз *ддз*: *суддзя, разводдзе, аддзел.*

1г. Увесці наступнае правіла:

пісаць мяккі знак для абазначэння мяккіх зычных *з, с, ц, дз* перад наступным мяккім зычным: *сьнег, прозьвішча, радасьць, лазьня, цьвік, дзьверы, будзьце, шэсьцьдзесят, штосьці, ледзьве, пісьменнік, васьмю, авоські, паўзьверх, паўзьмены, бязьмежны, зьверху, бесьперапынна, расьпісацца, бесьперспектыўнасьць, бязьзьменнасьць;*

пісаць мяккі знак перад суфіксам *-ск-* у прыметніках, утвораных ад назоўнікаў, якія заканчваюцца мяккім *н*: *коньскі, восеньскі, астраханьскі, Любаньскі (раён), чэрвеньскі, ліпеньскі, жнівеньскі, сьнежаньскі, студзеньскі;*

мяккі знак пісаць таксама пасля прыставак, якія канчаюцца на *з*, перад *е, ё, ю, я* і націскным *і*: *зьезд, зьёрзаць, разьюшаны, зьялізаць, зьнець.*

Мяккі знак не пішацца:

перад мяккімі *г, к, х*: *скінуць, згінуць, схіліцца;*

пасля прыназоўнікаў, якія канчаюцца на *з*: *цераз пень, паўз лес, без мяне, з яго, праз сьнег;*

паміж падоўжанымі зычнымі: *зелле, насенне, куццё, ралля, калоссе, разводдзе.*

2. Падпарадкаваць агульнаму правілу правапісу *е, я* ў першым складзе перад націскам напісанне слоў *дзевяты, дзесяты, семнаццаць, васемнаццаць* і аднакарэнных з імі і пісаць *дзяевяты, дзяевятка, дзявяцера, дзясяты, дзясятнік, дзясяцера, сямнаццаць, васямнаццаць, васямнаццаты* і г.д.

Згодна з гэтым правілам, пісаць злучальны галосны *е* або *я* ў складаных словах: *вогняўстойлівы, земляўласнік, заходнярускі, зерняўлоўнік, зерняховішча, зернесушылка, своегасаблівы.*

3. Канцавыя спалучэнні асновы *-эр, эл (ь)* іншамоўных слоў перадаваць у ненаціскным становішчы праз *-ар, ал (ь)*: *ваўчар, ордар, містар, камп'ютар, карцар, світар, шніцаль, шпіндаль, міталь, шпаталь, форталь, Картар, Геншар, Гендаль, Карал.*

4. Напісанне пачатковага ненаціскнога *у* ў запазычаных словах падпарадкаваць агульнаму правілу правапісу *у, ў*: *студэнтам нашага ўніверсітэта, правесці ўніфікацыю, вучнёўская ўніформа, належаў да ўніяцкага веравызнання.*

5. На канцы запазычаных слоў пісаць *іё, ыё*, а не *іо, ыо*: *трыё, радыё, рацыё, сальфеджыё, Антоніё, Сільвіё, Рыё-дэ-Жанейра.*

6. Кожную састаўную частку складаناскарочаных слоў пісаць так, як яна пішацца ў адпаведным поўным слове: *гарсавет, сельмаг, прафсаюз, сацпартыя.*

У апошняй частцы некаторых складанаскарочаных слоў можа аднаўляцца этымалагічнае *о*, і тады дапускаецца іх дваякае напісанне: *выканкам і выканком, селькар і селькор, спецкар і спецкор, агрупрам і агрупром.*

7. Дапускаецца перадача ўзмацняльнай часціцы і злучніка *і* літарай *й*, калі папярэдняе слова заканчваецца на галосны: *яна і пытаецца — яна й пытаецца; ды і дадому прыходзіць позна — ды й дадому прыходзіць позна; будзе свята і на нашай вуліцы — будзе свята й на нашай вуліцы; бацька і сын — бацька й сын.*

8. У прыметніках, утвораных ад назоўнікаў іншамоўнага паходжання, у злучэнні *ст* перад суфіксам *-н-* адпаведна літаратурнаму вымаўленню *т* на пісьме не перадаваць: *баласт — баласны, фарпост — фарпосны, аванпост — аванпосны, кампост — кампосны, кантраст — кантрасны.*

9. Ва ўсіх выпадках у прыметніках, у якіх канцавы зычны асновы *к* спалучаецца з суфіксальным *с*, спалучэнне *-кс-* перадаваць праз *ц*: *узбецкі, таджыцкі, каракалпацкі, калмыцкі, гіляцкі.*

10. Спалучэнне *сч*, якое паходзіць з *ск*, перадаваць праз *шч* у словах *пяшчаны, пяшчанік, пяшчанікавы, пяшчанка, пяшчынка, пяшчана, брушчатка, брушчатнік, брушчаты* згодна з літаратурным вымаўленнем.

11. Асабовыя ўласныя ўмёны пісаць згодна з нацыянальнай традыцыяй, улічваючы пажаданні бацькоў і носьбітаў.

Побач з напісаннямі *Ілля, Ілліч, Іллічоўка, Ульяна, Ульянаўскі, Кассян* дапускаецца напісанне *Ілья, Ільіч, Ільічоўка, Ульяна, Ульянаўскі, Касьян.*

Побач з напісаннямі *Жана, Сюзана* дапускаецца напісанні *Жанна, Сюзанна*, але толькі *Таціяна.*

12. Правілы пераносу слоў сфармуляваць наступным чынам:

1. З аднаго радка ў другі часткі слоў пераносяцца па складах: *саро-ка, га-ла-ва, стра-ва, тэ-атр.*

Але:

а) адну літару, хоць яна і ўтварае склад, нельга ні пакідаць, ні пераносіць у новы радок: *аса-ка, ава-дзень.* Некаторыя словы нельга наогул разбіваць пераносам: *Азія, асот.*

б) літары *ў, і, ь* і *апостраф* нельга адрываць ад папярэдняй літары: *няў-да-ча, слаў-ны, праўнук, се-наў-бор-ка, вай-ско-вы, няй-на-чай, най-гор-шы, вель-мі, ве-льмі, гуль-ня, гу-льня, кась-ба, ка-сьба, пад'-езд, па-д'езд.*

2. Пры збегу зычных у сярэдзіне слова падзел яго на часткі адвольны: *ся-стра, сяс-тра, сяст-ра; бу-льба, буль-ба, ра-зна-стай-ны, раз-нас-тай-ны; пад-крэ-сліць, па-дкрэс-ліць; спа-ды-спа-ду, спа-дыс-па-ду; мя-сцком, мяс-цком, мясц-ком.*

Нельга разбіваць спалучэнні літар *дж* і *дз*, калі яны абазначаюць адзін гук: *ура-джай, са-джу, ра-дзі-ма, за-дзі-ра.*

КАМІСІЯ.

ГІСТАРЫЕГРАФ

Сіротка

□ Мікола БАГАДЗЯЖ,"ЧЗ"

28 лютага 1616 года па Нясвіжы рухалася маўклівая працэсія. Яе складалі дробныя шляхціцы, мяшчане, каталіцкія манахі і прадстаўнікі буйнейшых магнацкіх родаў дзяржавы. Яны праводзілі гаспадара Нясвіжа (і яшчэ процьмы гарадоў і мястэчкаў) ваяводу віленскага князя Мікалая IV Крыштафа Радзівіла Сіротку. Гэта яго падарожжа было нядоўгім — ад радавога замка да сямейнага склепа.

Нарадзіўся Мікалай Крыштаф тут жа, у Нясвіжы, у драўляным замку славутага апекуна кальвіністаў Мікалая Радзівіла Чорнага. Імя Мікалай атрымаў па сямейнай традыцыі — у ёй існаваў звычай менавіта так называць першынца. Мянушцы ж абавязаны вялікаму князю літоўскаму і каралю польскаму Жыгімонту Аўгусту. Пад час чарговага гасцявання ў замку манарх пачуў дзіцячы плач, які даносіўся з адной са святліц. Зазірнуў туды і ўбачыў усімі пакінутага хлопчыка ў люльцы. Паклікаў служанку і загадаў неадкладна супакоіць "сіротку". Гэта выпадковае слова так назаўжды і прыстала да немаўляці на ўсё жыццё. Справа ў тым, што Радзівілы заўжды дабаўлялі да аднолькавых імёнаў прадстаўнікоў свайго роду парадкавыя нумары і мянушкі. Тым самым яны нібы прыраўноўвалі сябе да манархічных дынастый Еўропы.

Вучыўся Мікалай Крыштаф спачатку ў пратэстанцкай гімназіі, якую стварыў у Нясвіжы яго бацька, а потым у Германіі. Пасля шмат падарожнічаў. Пабываў у Італіі, Аўстрыі, Францыі. Пад час падарожжа пазнаёміўся з папскім нунцыем, кардыналам Камедоні і езуіцкім прапаведнікам Пятром Скаргай. І раптоўна (для навакольных) здраджвае веры бацькі і "адрокшыся публічна ад памылак кальвінісцкай веры", прымае ў 1567 годзе каталіцтва. Даследчыкі па-рознаму тлумачаць гэты яго крок. Адны сцвярджаюць, што ён паабяцаў перахрысціцца пад час цяжкай хваробы. Другія — што гэта вынік красамоўства Пятра Скаргі. Трэція, як, напрыклад, аўтары змешчанага ў 1977 годзе ў часопісе "Нёман" артыкула "Музы Нясвіжа", упэўнены, што ён змяніў веру, каб атрымаць княжацкі тытул. Заўважу, што апошнія моцна памыляюцца. Яны забываюць на тое, што князем стаў яшчэ бацька Сіроткі Мікалай Чорны і што яго сын аўтаматычна атрымліваў гэты тытул у спадчыну. Хутчэй за ўсё гэта адбылося з-за таго, што Мікалай Крыштаф расчараваўся ў ідэях і мэтах кальвіністаў. Прыгадаем, што ў гэты час назіраецца масавы адыход шляхецтва ад рэфарматараў і пераход іх да каталіцызму.

З вандроўкі па Заходняй Еўропе юнак вярнуўся ў 1568 годзе. А ўжо ў наступным атрымаў пасаду надворнага маршалка літоўскага. Пачынаецца яго дзяржаўная і палітычная дзейнасць. У 1572 годзе адышоў у нябыт Жыгімонт Аўгуст. Адразу разгарэлася барацьба паміж магнацкімі групоўкамі. Кожная з іх імкнулася пасадзіць на вызвалены прастол свайго кандыдата. Тых жа было аж зашмат: імператар Свяшчэнная Рымскай імперыі Максіміліян II, яго сын эрцгерцаг Эрнэст, Ганна Ягелонка, маскоўскі цар Іван IV Грозны, шведскі кароль Іаан III, французскі прынц Генрых Анжуйскі. Сіротка ў гэтай барацьбе падтрымліваў кандыдатуру апошняга. За яго выступаў ён і на Віленскім, і на Рудніцкім Галоўным соймах. Генрых перамог. У жніўні 1573 года Мікалай Крыштаф разам з кіеўскім ваяводаю Аляксандрам Пронскім выехалі ў Парыж, каб запрасіць прынца. Разам з яго світай вярнуліся на радзіму. А праз паўгода вымушаны былі зноў збірацца ў Францыю. Бо кароль польскі Генрых, як вядома, збег са свайго каралеўства дадому. Дэлегацыя прывезла каралю-ўцекачу ультыматум — альбо ён неадкладна вяртаецца да падданых, альбо яго пазбаўляюць кароны. Вядома, тое, што Генрых не згадзіўся вяртацца да "дзікіх палякаў".

Шляхецтва Рэчы Паспалітай апынулася перад неабходнасцю зноў выбіраць караля. У краіне на шмат часоў усталявалася безуладдзе. Гэта і без таго цяжкае становішча ўскладнялася тым, што дзяржава даўно ўжо ваявала. Ішла Лівонская вайна. Іван Грозны пустошыў землі Вялікага княства Літоўскага. Яго войскі захапілі і зруйнавалі Полацк і шэраг іншых гарадоў. Праўда, на пэўны час было заключана перамір'е.

Выбары цягнуліся некалькі гадоў. У рэшце рэшт вырашана было запрасіць на прастол трансільванца Стэфана Баторыя. У 1576 годзе ён быў каранаваны. Першыя дзеянні новага караля былі накіраваны на ўкамплектаванне і ўзбраенне арміі. Рашучыя меры далі магчымасць сабраць вялікія сілы ў краіне. Грошы ж дазволілі запрасіць венгерскіх ды нямецкіх наймітаў. У 1579 годзе пачалося наступленне. Былі вызвалены Полацк і Вялікія Лукі. У жніўні 1581 года войскі Рэчы Паспалітай аблажылі Пскоў. Пасля яго захопу меркавалі рушыць на Ноўгарад і Маскву. Пскоў быў моцнай для тых часоў крэпасцю. А гарнізон і жыхары горада вырашылі не здавацца. Барацьба пад яго сценамі працягвалася да студзеня 1582 года. У рэшце рэшт Баторый зразумеў марнасць намаганняў і быў вымушаны пайсці на мірныя перагаворы. Па дагавору Полацк і Лівонія адыходзілі да Рэчы Паспалітай, а рускія землі, якія захапіў Баторый, былі вернуты Івану IV.

Сіротка падтрымліваў унутраную і знешнюю палітыку Стэфана Баторыя. У 1579 годзе ў бітве пад Полацкам ён быў моцна паранены ў галаву і часова пакінуў службу. Папраўляючы здароўе, Мікалай Крыштаф лячыўся на лепшых курортах Германіі і Італіі. Пэўна ў той час у яго з'явілася думка зрабіць паломніцтва ў Іерусалім. Падарожжа пачалося 16 верасня 1583 года. 8 снежня наш зямляк быў ужо ў Венецыі. У Італіі ён затрымаўся надоўга і толькі 17 красавіка наступнага года адплыў у Палесціну. У дарозе Сіротка вёў дзённік, у якім занатоўваў свае ўражанні. Цікава, што рэлігійныя інтарэсы ў гэтых запісах адыходзяць на другі план. Больш цікавілі падарожніка прыродныя з'явы і падзеі, а не біблейскія паданні.

Апісваючы храмы, палацы, руіны, ён у першую чаргу расказвае аб іх месцазнаходжанні, выглядзе і матэрыяле, з якога яны зроблены, прычым даволі часта параўноўвае ўбачаныя пабудовы з італьянскімі і французскімі. Мікалай Крыштаф неаднойчы абвяргаў тыя ці іншыя сцвярджэнні з Біблії. Так, убачыўшы прыпіску, у якой быццам бы апостал Філіп хрысціў еўнуха царыцы Кандацеі, ён заўважыў: "...крыніца з цеснай скалы выходзіць, і такая бедная, што абедзвюх ног не было б чым паліць. Таму хутчэй трэба казаць, што святы апостал толькі галаву яму паліў і яго ахрысціў". Тое ж самае адбылося на берагах Мёртвага мора. Марна шукаў Сіротка саляную статую жонкі Лота. Затое наколькі ўразіла яго прыгажосць гэтага мораў! З якой пазітычнасцю (інакш не скажаш) апісаў ён убачанае: "Гэта мора... сярністае, мае і камяні навокал сябе, якія, калі іх запаляць, гараць, як дрэва... Іосіф Флавій праўдзіва гэта мора апісвае, а асабліва тое, што тройчы яно змяняецца за дзень, гэта я добра бачыў, бо зранку вада была чарнаватай, пад паўдня, калі сонца яго награе (бо там моцная гарачыня), дык становіцца блакітнай уся вада накшталт блакітнага сукна, надвячоркам, а перад захадам сонца, калі сонечная гарачыня спадзе, вада становіцца чырванаватай або рудой, бы яе з глінай змяшалі".

Нават пры наведванні іерусалімскага храма Труны Гасподняй Сіротка звярнуў увагу не столькі на старажытную архітэктуру, колькі на надмагільныя пліты гістарычных асоб — кіраўнікоў крыжаносцаў. Але больш за ўсё цікавілі яго прыродныя ўмовы і гаспадарка тых месцаў, дзе пабываў. На Крыце, напрыклад, занатаваў у свой дзённік: "...бачыў там і тое, як бавоўну сеюць, ад чаго прыбыткі дзіўныя штогод ідуць, бо караблі адтуль нічога іншага не бяруць, акрамя солі і бавоўны, як і той карабель... на якім мы сюды ўпершыню прыплылі".

Шмат пісаў Сіротка і пра дзівосных жывёл і птушак, якіх убачыў сам: хамелеонаў, кракадзілаў, страусаў, бегемотаў.

Пасля Палесціны наш зямляк пабываў у Сірыі, Ліване, Егіпце. У Егіпце агледзеў сфінкса, піраміды, пячоры са старажытнымі пахаваннямі. У гэтых пячорах Сіротка ўбачыў мноства забальзаміраваных чалавечых целаў і зацікавіўся саставам, пры дапамозе якога робяцца мумі. "Штосьці асабліва гэта павінна быць, бо і зараз, праз тры тысячы гадоў і больш, як гісторыя піша, не дазволілі самай малой частцы згнісці". Вялікую ўвагу Мікалая Крыштафа выклікала земляробства. Ён апісаў значэнне разліваў Ніла для гаспадарчай дзейнасці краіны. Прыкмеціў ён і народныя звычаі і святы, і ўзаемаадносіны. Даволі часта нагадваў аб жорсткіх адносінах турэцкіх чыноўнікаў да жыхароў пакораных Турцыяй народаў. У кастрычніку 1584 года Сіротка са сваімі спадарожнікамі накіраваўся дадому. Як і любы іншы вандроўнік, ён прыхапіў з сабою такія-сякія сувеніры. Сярод іх было некалькі пар паўлінаў, два леапарды, дзікія козы і нават... дзве мумі. Карабель, на якім ён адплыў з Александрыі, трапіў у моцны шторм. Экіпаж быў упэўнены, што гэта бяда адбылася з-за мумій. Нягледзячы на пратэсты Мікалая Крыштафа, іх выкінулі ў мора. Непрыемнасці працягваліся і на сушы. У Італіі вандроўнікаў абрабавалі. Ледзь-ледзь дабраліся яны да Рыма. Там становішча адразу палепшылася. Сіротка пабываў на прыёме ў папы, сустрэўся з кіраўнікамі Мальтыйскага ордэна, купіў палац у Балоні і накіраваўся на радзіму.

7 ліпеня 1584 года ён вярнуўся ў Нясвіж. І, як адзначыў у сваіх "Вандроўках па маіх былых ваколіцах" У.Сыракомля, "гэта... паклала пачатак новай эпохі ў гісторыі горада..." Сіротка распачаў у ім шырокае будаўніцтва. Перш-наперш ён пачынае будаваць замест драўлянага мураваны замак. Потым узводзіць шэраг іншых архітэктурных комплексаў — бернардзінскі, дамініканскі і езуіцкі манастыры з касцёламі. Будынак кальвінісцкай гімназіі перадаецца езуітам для іх калегіума. Для праектавання і кіраўніцтва будаўнічымі работамі запрашае з Італіі славутага архітэктара Яна Марыю Бернардоні. Сіротка імкнецца да таго, каб горад адбудоўваўся, рос, квітнеў. Надае гараджанам шэраг ільгот. Дамагаецца ў караля прывілеі на наданне гораду магдэбургскага права і герба. Аддае нясвіжскім мяшчанам бясплатна сядзібы, вінакурні, піўныя заводы і г.д. пры ўмове штогадовага ўзносу на бальніцу і школу.

Адначасова з тым ён выганяе кальвіністаў не толькі з Нясвіжа, а і з іншых сваіх уладанняў. Перадае іх маёмасць каталіцкаму духавенству. Скупляе і паліць кнігі, якія выйшлі з друкарні яго бацькі. Імкнецца ўсімі сродкамі паказаць, што цалкам парваў з рэфарматарамі. У гэты ж час распачаў бурную дзейнасць па "акругленню" сваіх уладанняў шляхам куплі, абмену, дарэння, атрымання ў спадчыну.

Пры такім актыўным жыцці не забывае ні на адпачынак, ні на дзяржаўную дзейнасць. Балі, паляванні, спрэчкі ў соймах. У 1586 годзе наш зямляк становіцца кашталянам трокскім, а ў 1590 годзе — ваяводай трокскім. У той жа год пачынае апрацоўваць дарожны дзённік. Ператварае яго ў кнігу. Да 1595 года робіць канчатковы варыянт. Сваё імкненне напісаць твор тлумачыць жаданнем пашырыць кругагляд землякоў. Падкрэслівае, што піша аб тым, што бачыў сам, а не прачытаў у іншых падарожнікаў.

Разам з тым падрабязна знаёміцца з літаратурай пра Блізкі Усход. У яго кнізе мноства спасылак на гэту літаратуру, але ён не слепа "здзірае" ў іншых аўтараў, а аналізуе прачытанае. Даволі часта выказвае нязгоду з тым ці іншым сцвярджэннем. Так, у кнізе манаха Кердэна сустрэў недарэчнае выказванне пра бегемота і заўважыў: "Кердэн піша, што такой велічыні гэты звер бывае, што слана можа цалкам праглынуць, але, каб ён мог з'есці слана, гата немагчыма". Кніга, названая "Падарожжа да Святой Зямлі, Сірыі і Егіпта", выйшла ў 1601 годзе на польскай мове.

Напружаная праца над кнігай не адрывала, аднак, Сіротку ні ад забаў, ні ад спраў. Ён працягваў барацьбу з рэфарматарствам і праваслаўем. Проста цяжка паверыць, што гэта той самы "паломнік", які правёў у Егіпце ў чатыры разы больш часу, чым у Палесціне, што гэта той самы аўтар, які на старонках сваёй кнігі неаднаразова абвяргаў тыя ці іншыя выказванні Біблії, але гэта так. Больш таго, ён у якасці даверанай асобы караля прысутнічаў на царкоўным саборы 1506 года ў Брэсце і выступіў на ім ад імя караля і свайго імя з патрабаваннем прыняць рашэнне аб аб'яднанні праваслаўнай і каталіцкай царквоў у Рэчы Паспалітай, аб утварэнні уніяцкай царквы. І ён жа, цудоўна разумеючы, што уніяцтва — малочны брат каталіцтва, аказаў прыхільнікам новай веры ўсялякую дапамогу. З яго лёгкай рукі каля Нясвіжа быў заснаваны грэка-каталіцкі манастыр.

Хто ведае, чаго б дасягнуў і што паспеў зрабіць гэты чалавек, калі б не смерць. Аднак і таго, што ён пакінуў нашчадкам, хапіла б на некалькі чалавек. І ці то воля Бога, ці лёс так распарадзіўся, што перажылі яго тварэнні і полымя войнаў і паўстанняў, і час, і н

СПОРТ

Ад біятлона да валейбола, не забываючы і пра футбол

Няўдалае выступленне на доўгіх біятлонных дыстанцыях чацвёртага этапа Кубка свету беларускіх спартсменаў было зразумелым. Не паспеўшы як след адпачыць пасля гонак у Рупольдзінгу і яшчэ не акліматызаваўшыся ва ўмовах высакагор'я, нашы пачалі ў Італіі не вельмі добра. Лепшы вынік паказаў на дваццаціКіламетроўцы Алег Рыжанкоў, але і ён быў толькі шаснаццатым.

Затое ў спрынце беларуская зборная рэабілітавалася, ды яшчэ як. Святлана Парамыгіна зноў была лепшай на дыстанцыі 7 з палавінай кіламетра. Вадзім Сашурын на дзесяціКіламетроўцы быў дванаццатым.

І хаця ў хуткім часе ўсю нашу ўвагу прыцягне да сябе зімовая Алімпіяда, забыцца на футбол немагчыма.

22 студзеня ў Манчастэры адбылася жараб'ёўка адборачных груп чарговага чэмпіянату Еўропы, фінальны турнір якога пройдзе ў 1996 годзе ў Англіі. Зборная Беларусі выступіць у пятай групе, дзе акрамя яе будуць гуляць каманды Галандыі, Нарвегіі, Чэхіі, Мальты і Люксембурга. Што ж, на мінскім "Дынамо" чакаецца сапраўдны "зоркапад".

Навіна паменей з міні-футбола. У нядзелю ў Мінску завяршыўся чацвёрты розыгрыш Кубка Беларусі. У фінале сустракаліся мінскія "Будзаказ" і "Эліта". Толькі ў дадатковы час "Эліта" здолела перайграць леташняга чэмпіёна з лікам 3:1.

Працягвае бяспройгрышную серыю ў чэмпіянаце Міжнацыянальнай хакейнай лігі мінская каманда "Цівалі". У суботу яна перамагла ў гасцях навакузнецкі "Металург" з лікам 3:0. Сёння мінчане гуляюць у Казахстане з усць-каменагорскім "Тарпеда". Вось дзе прыйдзецца цяжка. А потым (27 студзеня) на чарзе слабы карагандзінскі "Будаўнік". Вынікі гэтых сустрэч абавязкова паведамім.

Валейбалісткі мінскага "Амкадора" двойчы прайгралі ў Іспаніі мясцовай "Мурсіі" ў 1/8 фінала Кубка чэмпіёнак. І ў першым, і ў другім матчы нашы ўзялі толькі па партыі — 1:3 і 1:3.

Яўген ПУЧКОЎ.

ОРГАНИЗАЦИЯ
Приобретет льдогенератор для бара
Тел. 470-918

Гальскі гараскоп

Хвоя (19.02–28.02; 23.08–2.09)

Вытанчаная. А. Рэнуар

Хвоя ведае сваю прывабнасць, крыху пагружана ў сябе, любіць прыемных людзей і прыгожыя рэчы. З выгляду здаецца слабай, але на самай справе ўмее змагацца з цяжкасцямі і ўладкоўвае сваё жыццё так, як ёй хочацца. Знаходзіць сябе ў любой дзейнасці. Добры сябар. У каханні палае агнём. Кожнае новае захапленне даволі хутка праходзіць. Перажывае шмат горкіх расчараванняў, перш чым знойдзе свой тып чалавека. У рабоце заўсёды знаходзіць задавальненне. Добры арганізатар, валодае стойкай жыццёвай пазіцыяй, што дае ёй сілы і імкненне да жыцця.

Вярба (1.03.–10.03; 3.09–12.09)

Меланхолік

Ф.Шапэн

Прыгожая, але сумная. Калі жанчына — вельмі прывабная. Мужчыны карыстаюцца вялікім поспехам у жанчын. Вельмі дасцінны, стройны, строгі ў манерах як у адносінах з людзьмі, так і ў асабістым жыцці. Мае артыстычныя здольнасці. Любіць прыгажосць у любой праяве, марыць аб прыгожым доме, адзенні, жанчыне. Любіць падарожнічаць, адначасова прывязаны да свайго дома, сям'і. У гэтым чалавеку — дзве натуры. Адна — спакойная, ураўнаважаная, другая — поўная неспакою. Нягледзячы на гэта, мае вельмі мяккі характар, справядлівы. Калі ёсць права выбару, абавязкова выбірае цяжкі шлях. Дае магчымасць кіраваць сабой блізкім людзям, але ў жыцці — гэта чалавек цяжкі, капрызны, залежыць ад настрою.

Ліпа (11.03– 20.03; 13.09–20.09)

Скептык

Гэта можа падацца дзіўным, але гэтыя людзі з цягам часу будуць мець усё большы поспех як сярод сяброў, так і ў сям'і. Спакойна прымае рашэнні, усе ўдары лёсу пераносіць стойка. Характар нешматслоўны, лянівы, але ўвогуле прыемны і ўступчывы, працавіты. Барацьба і паспешлівасць — яе ворагі. Марыць аб багатым жыцці, аб мэтах, якія не могуць ажыццявіцца. Марыць і скардзіцца. Але, нягледзячы на гэта, жыць з ёй лёгка, бо яна ўмее прысвячаць сябе блізкім. Рэдка знаходзіць шчасце ў каханні. Інтэлігентная, здольная, але не развівае свае таленты, таму што не хапае настойлівасці. Ліпа вельмі раўнівая і падазроная да партнёраў, сяброў.

Дуб (21.03)

Моцная натура.

І.С.Бах.

Дуб вельмі прыгожы і жыццяздольны. Нават жанчына — дуб не мае патрэбы ў абароне і часта з'яўляецца партнёрам больш моцным як у фізічных, так і разумовых адносінах. Салідарнасць, высакароднасць — характэрныя рысы. Здароўе цудоўнае, не вытрымлівае хвароб, не любіць урачоў, нават выгляд крыві дзейнічае яму на нервы. Акрамя сілы, яму характэрна смеласць. Ва ўсіх сітуацыях выглядае як герой. Сіла характара, якая не мае нічога агульнага з гібкасцю, часта дорага яму абыходзіцца, прыносіць шмат непрыемнасцей. Вельмі ліберальны, лічыцца з поглядамі і свабодай іншых людзей. Незалежны, не церпіць насілля. Характар у цэлым гасцінны, таварыскі. Можа закахацца з першага погляду і верыць, што пакахаў на ўсё жыццё. Не любіць перамен. Кансерватар у адносінах да іншых. Дуб — дрэва высакароднае, пладавітае. Шукайце магчымасць заўсёды быць пад яго абаронай.

Сліва (23.09)

Мудры.

Не пазбаўлена прывабнасці, але вельмі павярхоўная. Любіць сонца, усё жыццё яна пакутуе на рэўматызм. Не мяшаецца ў жыццё сваіх блізкіх. Цярпенне і далікатнасць не маюць нічога агульнага з абыякавасцю. Наадварот — вельмі глыбока перажывае справы сваіх блізкіх. Характар спакойны. Справядлівая, крыху псіхолаг. Стараецца зразумець іншых людзей. Яе паважае ў каханні партнёр, калі нават прыносіць гэтым боль. Гэта не слабасць, а жыццёвая філасофія. Інтэлігентная, сціплая, любіць кнігі, асяроддзе разумных людзей, прыносіць у дом шчасце і спакой.

Арэшнік (22.03–31.03; 24.09–3.10)

Незвычайнасць.

М. Пруст.

Часцей за ўсё сціплы, чым эфектны. Аказвае дзіўны ўплыў на людзей, умее падабацца. Добразычлівы ў адносінах да іншых людзей, дапамагае жыць. Часцей за ўсё гэта дзялок, баец, але пры гэтым клапоціцца аб сваім асабістым жыцці, а не аб жыцці блізкіх, у каханні часта капрызны, хоць цярплівы да партнёраў. У большасці — жыццё арыгінальнае і мэтанакіраванае.

Рабіна (1.04–10.04; 3.10–13.10)

Уражлівасць.

Ш. Бодлер.

На выгляд здаецца далікатнай, але гэта толькі здаецца. Можа супрацьстаяць бурам і ўдарам лёсу. На яе твары часцей убачыце ўсмешку, чым слёзы, сваю і чужую непрыемнасць перажывае вельмі глыбока. Але пры гэтым па прыродзе абаяльная, ураўнаважаная, спакойная, незгаістычная, адначасова незалежная. Жыве для жыцця. Любіць рух, неспакой і нават цяжкасці. Часта ўскладняе сабе жыццё праэмерным філасофстваваннем. Густ і ўражлівасць дапамагаюць у артыстычнай рабоце. Але можа дасягнуць поспеху і ў іншых галінах. У каханні — непрадказальная. Пыхлівая, страсная. Моцная натура, праўда, не заўсёды правільна выбірае мэту сваіх інтарэсаў і захапленняў, у тым ліку і любоўных, сексуальных, дзелавых і г.д.

С.АНУПРЫЕНКА,
кандыдат філасофскіх навук.

ПЕРАПІСКА

Давайце пазнаёмімся

Паважаныя спадары і спадарыні!

"Чырвоная змена" прымае аб'явы для завочнага клуба знаёмстваў бясплатна.

"Пазнаёмлюся з мужчынам 25-30 гадоў. Валасы ў мяне кароткія, светла-каштанавыя, вочы вялікія зялёныя. Па гараскопу Рак.

Пісаць па адрасу: Свярдлоўская вобласць, г.Ніжні Тагіл, вул.Касманаўтаў 30-2. Ксюшы. Не забудзьцеся пакласці фота."

"Буду рады знаёмству з дзяўчынай ці жанчынай (да 40 гадоў), якая зможа зразумець мяне і, магчыма, стане сяброўкай у маім нялёгкім жыцці.

Пра сябе: Сяргей, 19\178, валасы цёмныя, вочы карыя. Па гараскопу - Блізняты, кот. За два гады скончыў 3 класы мастацкай школы. З гады літаратурна-творчай студыі, Іграю на гітары, пішу свае вершы і музыку. Нарадзіўся ў г.Рэчыца Гомельскай вобласці.

Пісаць на адрас: 213800, Бабруйск, УЖ 15\2, 162 брыгада. Драгуну Сяргею Віктаравічу."

"Мілыя жанчыны! Цікавы малады мужчына 28\180\70 пазнаёміцца з простай добрай жанчынай да 35 гадоў для стварэння сям'і.

У дадзены момант знаходжуся ў месцах зняволення.

Пісаць на адрас: 220600, г.Мінск, вул.Апанскага-36, п\с 35-13. Шаўрову Юрыю Мікалаевічу."

"Малады сімпатычны хлопец (22\70\189) жадае пазнаёміцца з сімпатычнай дзяўчынай не старэйшай за 25 гадоў, без шкодных звычак, якая зможа мяне зразумець.

Пісаць на адрас: г.Ваўкавыск, УЖ 15\11, 2-23, Мяшэчка Андрэю Міхайлавічу."

"Вельмі цяжка ў наш складаны час жыць адной. Можа знойдзецца той адзіны, аб кім я мару шмат гадоў...

Для сяброўства і сумеснага жыцця пазнаёмлюся з прыстойным чалавекам 21-26 гадоў без шкодных звычак. З месца зняволення прашу мне не пісаць.

Пра сябе: Таня, 21\171\67, Стралец, вочы карыя, валасы светлыя.

Хачу кахаць і быць каханай.

Адрас у рэдакцыі (абанент 24)."

ГАСПАДЫНЯ

Наўрад ці можа хто з нас упэўнена сам пра сябе сказаць: я ведаю абсалютна ўсё. Няма такіх людзей. Нездарма нарадзіўся выраз: "Век жыві — век вучыся". Вось мы і вучымся. Не толькі розным навукам, а яшчэ і розным жыццёвым правілам, тонкасцям, вучымся таму, што нарадзіў розум і вопыт многіх пакаленняў людзей.

Ну вось, напрыклад, ці дасканала мы валодаем правіламі культуры ўзаемадносін людзей? Ці ведаем, як сябе паводзіць у грамадскім месцы, як знаёміцца, як вітацца, якія падарункі і каму дарыць, як іх прымаць і г.д. Існуюць агульнапрынятыя правілы і ведаць іх не шкодзіць нікому.

Вы прыйшлі ў госці і сустрэлі там незнаёмых людзей. Павітайцеся з гаспадарамі, а астатнім ветліва кіўніце. Пачакайце, калі гаспадары пазнаёмяць вас з усімі.

Калі ў кампаніі ёсць вашы знаёмыя, не імкніцеся адразу ж з імі вітацца, пакідаючы без увагі тых, каго бачыце ўпершыню. Гэта няветліва.

* * *

Калі прыходзяць у госці муж і жонка, то жонка павінна прадставіць мужа, а не наадварот. Яна ж першай вітаецца з гаспадарамі.

* * *

Запомніце, пры знаёмстве нельга быць назойлівым, надакучлівым. Такімі паводзінамі ніколі не дасягнеце сімпатыі да сябе. Пачынаць размову з незнаёмай жанчынай на вуліцы, у парку, у рэстаране з мэтай "завязаць" знаёмства — нетактоўна. Калі такую ж "ініцыятыву" праявіць жанчына, гэта будзе выглядаць проста непрыстойна.

* * *

Калі знаёмяць людзей, то прытрымліваюцца такіх правілаў: малодшага прадстаўляюць старэйшаму, мужчыну — жанчыне. Трэба пры гэтым назваць поўнасцю імя, імя па бацьку, прозвішча таго, каго прадстаўляюць.

* * *

А вітаюцца людзі так: малодшы вітаецца са старэйшым, мужчына з жанчынай. Аднак руку першым падае старэйшы малодшаму, жанчына — мужчыну. Праўда, мужчына можа першым падаць руку жанчыне, калі ён значна старэйшы за яе па ўзросту.

Не трэба вельмі ціснуць руку, якую вам падалі пры знаёмстве. Дарэчы, жанчына можа падаваць руку ў пальчатцы, гэта яе права.

* * *

Цалаваць руку жанчыне пры першым знаёмстве не варта. Гэта прывілея добра знаёмых людзей. А цалаваць руку дзяўчыне наогул не прынята.

* * *

Пры сустрэчы са знаёмымі не чакайце, калі з вамі павітаюцца. Пастарайцеся павітацца першым.

* * *

Ніколі не размаўляйце са старэйшым за вас чалавекам седзячы, калі ён стаіць. Прапануйце яму сесці або ўстаньце самі.

* * *

Калі ідзяце па вуліцы з жанчынай, трымайцеся злева ад яе. Прытрымліваць жанчыну за локаць не трэба. Робіцца гэта толькі тады, калі вы дапамагаеце жанчыне сесці ў трамвай і аўтобус. А выходзіць з транспарту першым мужчына і падае жанчыне руку, дапамагае ёй сысці.

Спускаючыся па лесвіцы, мужчына ідзе крышачку наперадзе жанчыны, а падымаючыся — крышачку ззаду.

* * *

Калі мужчына суправаджае дзвюх жанчын, ён ідзе не ў цэнтры, як часта лічаць, а з левага боку. Месца ў цэнтры больш ганаровае, яго павінна заняць адна з жанчын, магчыма, старэйшая па ўзросту.

* * *

А ці ўмееце вы дарыць падарункі? А атрымліваць іх? Не думайце, што гэта зусім проста. Тут таксама існуюць пэўныя правілы.

Ніколі не дарыце непатрэбныя чалавеку рэчы, карыстаючыся даўняй прымаўкай: "Доранаму каню ў зубы не глядзяць". Не абавязкова, каб падарунак быў дарагі. У залежнасці ад выпадку, згодна з якім робіцца падарунак, ён можа мець канкрэтную асаблівасць.

* * *

На наваселле ці на вяселле дорацца якія-небудзь гаспадарчыя рэчы — посуд, сталовая ці пасцельная бялізна, бытавыя прыборы і г.д. Жаніх можа падарыць нявесце каштоўны падарунак.

* * *

На дзень нараджэння можна падарыць любую рэч, але абавязкова такую, якая спадабалася б, каб парадавала імянінніка, каб з'явілася для яго сюрпрызам.

Ну, вядома ж, заўсёды жаданы падарунак — букет кветак.

На 8 Сакавіка муж дорыць жонцы падарунак па яе жаданню. Знаёмыя і сябры дораць жанчынам кветкі.

* * *

Вельмі нетактоўна з боку мужчын дарыць жанчынам ці дзяўчатам прадметы інтымнага туалету. Такія падарункі можа зрабіць сястра, сяброўка, маці.

* * *

Ніколі не робіце ананімных падарункаў. Чалавек, які сябе паважае, не павінен такі падарунак прымаць. Выключэннем могуць быць кветкі для жанчыны. Яны проста добры знак увагі і павагі.

* * *

Як падносіць падарункі? Ніколі не загортвайце тое, што збіраецеся падарыць, у газету. Пакунак павінен быць прыгожы і элегантны. Букет кветак ручаецца без папяровай ці цэлафанавай абгорткі.

Уручаючы любы падарунак, не выхваляйцеся, не імкніцеся падкрэсліць яго каштоўнасць ці адмысловасць. Віноўнік урачыстасці сам зробіць ацэнку вашай шчодрасці ці дасціпнасці.

* * *

Прымаючы падарунак, не адкладвайце яго ўбок, як гата часта робіцца. Разгарніце, паглядзіце, што вам падарылі. Чалавек, які прынёс падарунак, хацеў зрабіць вам прыемнае, парадаваць вас. Пастарайцеся быць удзячнымі за любы падарунак.

Калі ж вам рэч не спадабалася, не падавайце выгляду, што вы расчараваны. Не рабіце заўваг накшталт: "У мяне гэта ёсць" ці "Гэта не мой колер" і да т.п. Падзякуйце, пакажыце сваё захапленне. Гэта ж няцяжка?

КІНААФІША МІНСКА

"Амерыканскі шпіён"

Каляровую мастацкую кінастужку з такой назвай знялі кінематаграфісты Масквы. Яе паставіў па сцэнарыю Андрэя Гафураве рэжысёр Леанід Папоў.

1945 год. Савецкі ваенны карабель знаходзіцца з сяброўскай місіяй у ЗША. Малады афіцэр Мікалай Каралёў знаёміцца з амерыканскай дзяўчынай Мэры, і паміж імі завязваецца раман.

Але шчасце закаханых працягвалася нядоўга — пільны супрацоўнік савецкай контрразведкі з іх узаемаадносін сфабрыкаваў "справу". На спробы арыштаванага ўсё растлумачыць — адзін адказ: "Ты — шпіён, яна — сувязная, а ваш раман не больш чым прыкрыццё". Мікалай хоча дачакацца суда, каб там дабіцца справядлівасці, але ўсё было прасцей: допыт, збіванне і завочны прысуд — 10 гадоў лагераў. Мэры, дабіўшыся спаткання, прапануе Мікалаю ўцячы, але той катэгарычна адмаўляецца...

Галоўныя ролі выконваюць Фёдар Сухаў, Айрын Торнтан, Ігар Клас, Юрый Юрчанка.

"І ўсё каханне"

Вытворчасць кінастудыі "Масфільм". Аўтары сцэнарыя — Сяргей Бадроў і Ірына Васільева, рэжысёр-пастаноўшчык — Анатоль Васільеў.

...Семнаццацігадовая выпускніца тэхнікума Валя Дзідзенка прыехала працаваць у калгас, дзе старшынёй быў Міхаіл Ражкоў — адзін з тых вясковых працоўных, хто не толькі самааддана "цягнуў" сваю гаспадарку, але спрабаваў стварыць сялянам неабходныя ўмовы працы. Засталася Валя працаваць і жыць у гэтым сяле толькі таму, што пакахала Ражкова, хоць з самага пачатку было зразумела, што шчасця з ім не будзе: Ражкоў быў жанаты, толькі што нарадзілася дзіця.

Між тым, старанную маладую трактарыстку заўважыла абласное начальства. Валін лёс быў уладкаваны. Падабралі дзяўчыне па анкетным даным жаніха, далі маладой сям'і кватэру, праславілі ў газетах, вылучылі ў дэпутаты... І вось ужо выступае Валянціна Дзідзенка з крамлёўскай трыбуны, атаварваецца спецпайкамі... І нарэшце вышэйшы пік яе ўзлёту — запрашэнне на сустрэчу з самім Леанідам Ільічом Брэжневым...

Падзеі фільма адбываюцца ў "застойныя" часы, калі раўнадушная дзяржаўная машына ламала многія чалавечыя лёсы.

У галоўных ролях заняты Ірына Бякава, Сяргей Варчук, Юрый Платонаў, Васіль Пятрэнка, Ігар Скібін, Юрый Назараў.

"Паміж нядзеляй і суботай"

Гэта новая каляровая мастацкая кінастужка створана сумесна з кінастудыяй "XXI стагоддзе" і асацыяцыяй "Інвест-І". Яе паставіў па свайму сцэнарыю рэжысёр Акім Салбіеў.

Фільм зняты па ўсіх законах меладрамы. Маладзенькая актрыса Маргарыта, нявеста Віктара, радуецца перспектыве паехаць з ім працаваць у Мексіку, хоць для гэтага ёй прыйдзецца на тры гады ахвяраваць сцэнай і кіно.

Па збегу акалічнасцей Маргарыта заканчвае здымацца ў фільме, на якім працуе бацька Віктара. Крыху экзальтаваная Маргарыта спрабуе перанесці кінематаграфічныя пачуцці ў рэальнае жыццё. Таму яе інтымныя ўзаемадносіны з Альбертам, партнёрам па фільму, пераносяцца за рамкі сцэнічнай пляцоўкі. Жонка Альберта, Тамара, пушкіназнаўца, захоплена сваёй працай і не вельмі апякае мужа. Шкада даверлівага Віктара. Альберт жа шчыра кахае жонку, а сувязь з Рытай — толькі прыемная інтрыжка. Але Рыта не ў стане цярпець іншую жанчыну побач з каханым чалавекам...

У фільме здымаліся Ірына Клімава, Вадзім Сцёпашкін, Акім Салбіеў, Вера Глаголева, Эдуард Марцэвіч.

"Гангстэры ў акіяне"

Карціна каляровая, двухсерыйная. Яна знята кінамайстрамі Маскоўскай кінастудыі імя М.Горкага і СП "АСК". Сцэнарый напісалі Аляксандр Лапшын і Сцяпан Пучынян, рэжысёр-пастаноўшчык — Сцяпан Пучынян.

...Амерыканскае судна ў акіяне тарпедзіравала невядомая падводная лодка. Маракоў падбірае наш сухагруз "Бердзянск". А хутка яго захопліваюць марскія піраты, якія дзейнічаюць пад філіпінскім сцягам... Пасля некалькіх допытаў нашы маракі разумеюць, што гэта самыя звычайныя гангстэры, якія спецыялізуюцца на крадзяжы чужых караблёў, вытворчасці і продажы бактэрыялагічнай зброі.

Карыстаючыся памылкай прыслугі і аховы, палонныя ўзбройваюцца і пасля рызыкоўных рукапашных схватак хутка авалодваюць сітуацыяй...

25 студзеня

«МАСКВА»: "Сямейства Дракулы"*** – 14.00, 18.00. "Няма куды больш бегчы" – 12.00, 16.00, 20.00, 22.00 (н.с.).

«КАСТРЫЧНІК»: "Мая мачаха – іншапланецянка" (1,5 с.). – 13.00, 16.25, 20.00. "Сямейства Дракулы"*** – 15.00, 18.30. Музычна-пацыяльная праграма "Макс-шоу" – 21.30.

«АЎРОРА»: "Кароль Драздавік" (д) – 10.00, 13.30. "Пра бізнесмена Фаму" – 15.30 (л), 17.30. "Пераступіўшы мяжу"** – 11.30, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 21.00. "У ложку з ворагам"*** – 11.30, 19.20, 21.10.

«БЯРЭСЦЕ»: "Паўночная гарачыня"*** – 12.00, 16.00, 19.30, 21.10. "Палаўнічыя за монстрамі" – 11.30, 15.00, 17.00, 18.30. "Споведзь палюбоўніцы" – 13.00, 20.20. "Міс Катастрофа" – 14.00, 17.40.

«ВІЛЬНЮС»: "Дзейнічай, Маня!" (1,5 с.) – 11.10, 16.20. "У ложку з ворагам"*** – 13.00, 18.10, 21.30. "Пераступіўшы мяжу"** –-14.40, 19.50. Відэазала: 13.10, 15.15, 17.20, 19.25, 21.30.

«ДРУЖБА»: "Пераступіўшы мяжу"** – 14.50, 20.00. "У ложку з ворагам"*** – 16.30, 21.40. "Дзейнічай, Маня!" (1,5 с.) – 13.00, 18.10. Відэазала: інфармацыйна-пацыяльная праграма – 19.30, 23.30.

«ПАРТЫЗАН»: "Сямейства Дракулы"*** – 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 (н.с.). "Няма куды больш бегчы" – 11.20, 14.20, 17.20, 20.20.

«ПЕРАМОГА»: "Пераступіўшы мяжу"** – 10.00, 18.30. "У ложку з ворагам"*** – 13.10, 16.30, 20.30. "Асабістае жыццё каралевы" – 11.50, 15.00. Відэазала: "Цяжкая мішэнь" – 10.00, 11.40, 13.20, 15.00, 16.40, 18.20, 20.00.

«САЛЮТ»: "Сямейства Дракулы"*** – 12.00, 13.20, 16.40, 18.00, 19.20, 20.40. "Мая мачаха – іншапланецянка" (1,5 с.) – 10.00, 14.40, 22.00 (н).

«СУЧАСНІК»: "Клас 1999"*** – 14.20 (л). "Японская лэдзі Чатэрлей"*** – 18.00, 17.40, 19.20, 21.00.

«БЕЛАРУСЬ»: "Адзін дома" – 10.30, 12.20, 14.10, 16.00, 17.50, 19.40, 21.30. "Ніндзя правіцеля" – 10.40, 15.50, 19.20. "Каб выжыць" (1,5 с.) – 14.00, 17.20. "Пачвара"** – 12.10, 20.50. Інфармацыйна-пацыяльная праграма – 20.30.

«КІЕЎ»: "Тайна горкага падзямелля" (д) – 13.00. "Адзін дома" – 14.20. "Каб выжыць" (1,5 с.) – 16.10. "Страснае лета"*** – 18.10, 19.30, 21.00.

«КАМСАМОЛЕЦ»: "Сэрцы трох-2" (2 с.) – 13.00, 19.20. "Паўночная гарачыня"*** – 12.00, 14.00, 18.30. "Цягнік у Каліфорнію" – 15.30, 17.30. Зала індыйскага фільма: "Бобі" (2 с.) – 18.00, 20.10.

«МІР»: "Сэрцы трох-2" (2 с.) – 13.40, 17.40. "Агенты КДБ таксама ўлюбляюцца"** – 12.00, 16.00, 20.00. "Паўночная гарачыня"*** – 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 20.50. У кінатэатры працуе відэазала.

«ПІЯНЕР»: "Хон Гіль Дон" (д) – 13.20. "Зачараваны хлопчык" (д) – 10.00. "Каб выжыць" (1,5 с.) – 11.20, 15.00, 18.50. "Драпежнік-2"*** – 17.00, 20.40. Відэазала: "Чалавек-ліза" (д) – 10.00, "Баявы гігант" – 11.40, 14.40, 17.40, 20.50. "Палаўнічыя за монстрамі" – 13.10, 16.10, 19.20. "Драпежнік-2"*** – 20.40. Пункт абмену валюты адкрыты з 10.00 да 17.00.

«РАКЕТА»: "Драпежнік-2"*** – 14.00, 18.00. "Сесілія"*** – 16.10, 20.00.

«РАДЗІМА»: "Равучы агонь" – 12.00, 19.10. "Адзін дома" – 13.40, 17.20, 20.50. "Каб выжыць" (1,5 с.) – 15.30. Відэазала: "Стагоддзе дыназаўраў" (д) – 16.00. "Чалавек-павук" – 18.00. "На прыцэле" – 20.00.

«ЦЭНТРАЛЬНЫ»: "Паўночная гарачыня"*** – 9.30, 15.30, 19.15, 21.00. "Прадказанне" (1,5 с.) – 11.10, 17.15. "Сэрцы трох-2" (2 с.) – 13.10.

«ЭЛЕКТРОН»: "Адзін дома" – 14.00, 15.50, 17.40, 19.30, 21.20. "Ніндзя правіцеля" – 13.20, 14.40, 17.50. "Мастацтва кахання"*** - 16.00, 18.10, 21.00.

«АВАНГАРД»: "Той, хто мяне шануе"** – 16.20. "Расплата за злачынства" (2 с.) – 18.00.

«ЗНАМЯ»: "У пошуках душы"*** – 20.00. "Драпежнік-2"*** – 16.00, 18.00.

«УДАРНІК»: "Драпежнік-2"*** – 14.00, 17.30. "У пошуках душы"*** – 15.50, 19.20.

ХАТНІ ЭКРАН

■ 25, аўторак

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Пад купалам Сусвету.
8.20. Надвор'е.
8.30. Пяць хвілін на жарты.
8.35. Фільм-балет.
9.00. Тэлебачанне – школе.
9.20. Тэлевізійны клуб "Гаў-гаў".
9.35. Фільм-канцэрт.
◆9.55. "Мой сябар – здраднік".
11.50. "Не абы-што!" Міжнародная праграма.
12.15. Песню бярыце з сабою. Частка 2-я.
13.30. Навіны.
13.40. Дзелавая хроніка.
13.50. "У.Высоцкі. Маналог".
14.50. "Пра тых, хто помніць". Тэл.дак.фільм.
15.25. Тэлебіржа.
15.35. "Ноч і К" – топ-10.
16.35. "Гісторыя аднаго кахання", "Эскізы да партрэта". Тэл.дак.фільмы.
17.20. Тэлебачанне – школе.
18.00. Дзелавая хроніка.
18.10. Абласныя навіны (Віцебск).
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. Эканамічная хваля. Прамая лінія.
19.50. Студыя "Тэлесябрыны".
19.55. Родныя слова. Тэлечасопіс.
20.30. Кантакт: адрасы, прапановы, інфармацыя.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. Пад купалам Сусвету.
21.45. Пяць хвілін на жарты.
21.50. Надвор'е.
22.00. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.
Пасля заканчэння –
◆Ніхто, акрамя цябе". Тэлесерыял; Тэлевізійны Дом кіно "Зоркі 2000".

Канал "Астанкіна"

5.00, 8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 24.00. Навіны.
• 7.45. "Кошчын дом".
8.20. Паглядзі, паслухай...
• 8.40. "Белы гарлачык".
8.50. Чалавек і закон.
9.20. "Час, я цябе міную..." І.Анісамава-Вульф.
10.10. Рок-урок.
10.50. Прэс-экспрэс.
◆11.20. "Дом на дзюнах".
◆12.25. "Кветкі запозненыя".
14.25. Дзелавы веснік.
14.40. Канверсія і рынак.
15.10. Справа.
◆15.20. "Мая сям'я і іншыя жывёлы". 4-я серыя.
15.50. "Чароўны свет" ш "Сінема".
16.10. Рок-урок.
16.50. Азбука ўласніка.
17.25. Аб духоўным адраджэнні Дагестана.
17.50. Дзіва. Міжнародны конкурс маладых дызайнераў.
18.05. Дакументы і лёсы.
18.10. Надвор'е.
18.15. Хакей. ЦСКА – "Лада".
20.35. Надвор'е.
20.45. Тэма.
21.30. Рэпартаж ні аб чым.
◆21.45. "Асенні марафон".
23.30. Клуб Кубертэна.
0.20. Прэс-экспрэс.

Канал "Расія"

8.00, 13.00, 19.00, 22.20. Весткі.
• 7.50. "Вясёлая карусель".
8.00. Сусветныя навіны Эй-бі-сі.
8.30. Клуб "Жоўтая падводная лодка".
◆11.05. "Порах".
12.40. Сялянскае пытанне.
13.25. "Сакрэтны заказ". Дак.фільм.
13.55. Тэлегазета.
14.00. Тэніс. Чэмпіянат Аўстраліі.
15.00. Паэзія М.Дудзіна.
15.30. Там-там навіны.
15.45. Студыя "Рост".
16.15. Новая лінія. "Адлюстраванне".
17.00. Аз есмь.
17.30. Панове-таварышы.
17.45. Прасцей простага.
18.45. Свята кожны дзень.
19.25. Падраблязнасці.
◆19.40. "Санта-Барбара".
20.30. Антрэпрыза. Ала Кажанкова.
21.20. Ціхі дом.
22.40. Аўтаімгненне.
22.45. Зоркі гавораць.
22.50. Спартыўная карусель.
22.55. Ваша права.
23.10. Канцэрт джазавай музыкі.
23.40. Музычны экзамен.

Санкт-Пецярбург

8.10. "Без на Марсавым полі". Тэлеспектакль.
9.25. Дзецям пра зверанят.
9.45. Казка за казкай.
10.20. Тэлемагазін.
10.30. Хуткая далямога.
11.00. Этнасы Зямлі.
11.30. Інфарм ТБ.
11.40. Канцэрт па заяўках.
12.25. Новыя часы.
13.00. Сустрэча кіраўнікоў горада з жыхарамі блакаднага Ленінграда.
16.10. "Ты помніш, Ладага", "Сакрэтны заказ". Дак.фільмы.
16.45. Там, дзе жыве Павуціньч.
17.00. Па сакрэту ўсяму свету.
• 17.10. "Нараджэнне таленту" і інш.
17.35. "Хіба серца забудзе..." Спявае Эдуард Хіль.
18.10. Вялікі фестываль.
18.30. Інфарм ТБ.
18.55. Гета ў серцы было маім...
19.40. Спорт, спорт, спорт.
20.00. Сёння.
20.40. Тэлемагазін.
20.50. Гістарычны альманах.
21.35. "Аб сябрах-таварышах". Фільм-канцэрт.
22.35. Ваш стыль.
22.45. Інфарм ТБ.
23.05. "Уладзімір Высоцкі – кінаакцёр". Дак.фільм.

8-ы канал

• 18.00. Шматсерыйны фільм для дзяцей "Карусель". Мультфільм "Фараон Тутанхамон" з серыі "Аміга і яго сябры".
18.30. Музычная праграма.
19.00. Спартыўная праграма фірмы "Жылет".
19.25. Камедыйнае шоу "Скрытая камера".
◆19.45. Паліцэйскі серыял "Хіл Стрыт Блюз": "Маладыя, прыгожыя і знаважаныя".
20.40. "Пані ўдача". Праз дзесяць гадоў.
◆21.30. Мастацкі фільм "Снягі Кіліманджара". 2-я серыя.
23.15. Праграма відэакліпаў.

■ 26, серада

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Пад купалам Сусвету.
8.20. Надвор'е.
8.30. Пяць хвілін на жарты.
8.35. Фільм-канцэрт.
9.00. Тэлебачанне – школе.
◆9.40. "Ніхто, акрамя цябе".
10.25. З вопыту працы школьных гурткоў школы № 71 г.Мінска.
10.45. Аэробіка. Урокі Наталлі Наважылавай.
• 11.20. "Смех і гора ля Бела Мора".
12.25. "Тэма для аргана". Кінанарыс.
12.35. "Скупы двойчы плаціць". Навукова-папулярны фільм.
13.30. Навіны.
◆13.40. "Простая гісторыя".
15.10. Музычная школа № 3 г.Мінска.
15.55. Відэзма-нявідзьма.
16.55. "Дзівосныя азёры". Тэл.дак.фільм.
17.10. Новаму часу – новыя людзі.
18.10. Абласныя навіны (Гомель).
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. "Пяць зорак".
20.00. ТА "Рэха". Крада.
20.20. Выступленне старшыні Саюза мастакоў Беларусі Генадзя Бураўкіна.
20.30. Кантакт.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. Пад купалам Сусвету.
21.50. Надвор'е.
22.00. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.
Пасля заканчэння –
◆"Ніхто, акрамя цябе". Тэлесерыял; "Песня, народжаная дружбай". Музычная праграма.

Канал "Астанкіна"

5.00, 8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 24.00. Навіны.
8.20. "Сарока". Дзіцячая інфармацыйная праграма.
◆8.40. "Проста Марыя".
9.30. Клуб падарожнікаў.
10.20. Джэм.
10.50. Прэс-экспрэс.
◆11.20. "Жаваранкі".
12.35. "Гартаючы старонкі". Цыркавая праграма.
13.30. В.Калістратаў. "Перавараненне". Канцэрт.
14.25. Прадпрымальнік.
15.20. "Мая сям'я і іншыя жывёлы". 5-я серыя.
• 15.50. "Грышкавы кніжкі".
16.00. Джэм.
16.30. Клуб-700.
17.25. Міждзяржаўная тэлерадыёкампанія "Мір".
17.50. Дакументы і лёсы.
18.00. Надвор'е.
◆18.05. "Проста Марыя".
18.55. "Святлана – дачка Іосіфа..." Частка 1-я.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.35. Надвор'е.
◆20.45. "22 чэрвеня, роўна ў 4 гадзіны..."
22.30. З першых рук.
22.45. Творчы вечар Аляксандра Буйнова.
23.40. Увесь г